# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 25 (2823) Год LV | Беласток, 20 чэрвеня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)




Каб толькі хацелася ☞ 3



Свята Гарадка ☞ 4

# ЗАКАЛОТ З НАЗВАЙ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА



Большасць членаў сходу прагаласавала за старую назву аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы"

**У час агульнага сходу членаў аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы", які адбыўся 11 чэрвеня ў музейнай кіназале, большасць дыскусіі тычылася прапановы змены назвы аб'яднання на „Цэнтр беларускай культуры", з якой выступіла музейная ўправа. Дыскусія ў гэтай справе была вельмі эмацыянальная, а большасць выступаючых старалася пераканаць сабраных, каб пакінуць старую назву, дзе галоўнае значэнне мае слова „музей", на якога пабудову збіраліся сродкі ў Польшчы і па-за нашымі межамі, а дзеля арганізавання музейнай дзейнасці многа дапамагла Рэспубліка Беларусь.**

— Каму перашкаджае назва „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы" і навошта гэтая змена. Усе беларусы свету збіралі грошы на музей, а не на „Цэнтр беларускай культуры" і на першым месцы трэба захаваць музейную дзейнасць, а пры ёй няхай будзе і іншая культурная актыўнасць, — заявіў Ян Хіліманюк, былы шматгадовы намеснік старшыні музейнага аб'яднання, а пасля і яго старшыня.

— Улады музея могуць мяняцца, але музей павінен астацца музеем беларусаў усяго свету. Калі ў вас ёсць сэрцы і душы, не дазваляйце зняць шыльду з назвай „музей", — гаварыў былы старшыня рэвізійнай камісіі Віктар Бура.

— Гэта хіба ўступ да ліквідацыі беларускага музея, — сказаў Аляксандр Харкевіч, былы музейны бухгалтар і пералічваў невялікія нацыянальнасці і этнічныя групы ў Польшчы, якія маюць свае музеі, са словам „музей" у назве.

— Хто будзе галасаваць за новае названне, будзе адразу галасаваць за ліквідацыю музея і нічога па нас не астанецца, — гаварыў усхваляваны юрыст Пётр Германюк.

У галоўным бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк і стараста Гайнаўскага павета Уладзімір Пятрочук стараліся пераканаць сабраных, што новае карацейшае названне аб'яднання гэта лепшы маркетынг для музея і звярталі ўвагу, што ў статуце аб'яднання і так будзе запісана музейная дзейнасць.

— Старая назва моўна непапраўная таму, што паняцце „культура" шырэйшае, чым „музейная дзейнасць" і ў сабе ўжо яе ахоплівае, а на лозунг „музей" не адчыняюцца дзверы ва ўстановах, якія маглі б нам фінансава дапамагчы. Назва мусіць мець маркетынгавыя козыры, а такой з'яўляецца назва „Цэнтр беларускай культуры", — пераконваў сабраных бурмістр Анатоль Ахрыцюк, які гаварыў, што будзе намагацца падтрымаць музей фінансава з бюджэту горада, каб можна было пагасіць бягучыя даўгі.

Старшыня музейнага аб'яднання Міраслаў Мордань удакладніў, што бурмістр выступіў да гайнаўскіх радных з прапановай прызначыць грашовую ўспамогу для музея памерам 35 тысяч злотых. Затое Наталля Герасімюк пераконвала, шта старая назва моўна папраўная і што гайнаўскую ўстанову наведваюць тысячы людзей менавіта таму, што тут ёсць музей. Калі паявілася ідэя паставіць на галасаванне прапанову, каб засталася ранейшая назва аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы", сабраныя ахвотна згадзіліся з гэтым, каб спыніць гарачую дыскусію. 15 удзельнікаў сходу паднялі рукі за тым, каб пакінуць ранейшую назву са словам „музей", 3 асобы былі супраць такой прапанове, а ўсе апошнія або стрымаліся ад галасавання (6 чалавек), або не прынялі ў ім удзелу. У час галасавання над зменамі ў статуце былі дабаўлены між іншым папраўкі, якія забараняюць раздзяляць музейную маёмасць на членаў аб'яднання і без згоды агульнага сходу прадаваць часткі музейнай маёмасці.

Яшчэ ў пачатку сходу сабраныя мелі нагоду пазнаёміцца з дзейнасцю музея і працай музейнага асяродка ў карысць беларускай культуры за апошнія гады, якія былі пасля станоўча ацэнены ўсімі ў галасаванні. Старшыня музейнага аб'яднання Міраслаў Мордань паінфармаваў, што за тры з паловай гады музей наведала 15 тысяч асоб, у выставачных залах за гэты перыяд былі наладжаны 44 выстаўкі, а ў кіназале адбылося 286 фільмавых сеансаў. Хаця кіно ў пачатку гэтага года спыніла агульнадаступную дзейнасць, бо не атрымала дафінансавання з гарадскога бюджэту, то ў музейных памяшканнях надалей можна дэманстраваць фільмы, хаця б прывезеныя з Беларусі. Старшыня Міраслаў Мордань у сваім выступленні звярнуў таксама ўвагу на арганізаваныя ў музейных памяшканнях канцэрты, спектаклі, літаратурныя і гістарычныя сустрэчы, гаварыў аб супрацоўніцтве музея з самаўрадамі ў час арганізавання 22 народных фэстаў. Пры музеі дзейнічалі тры музычныя калектывы і тэатральны калектыў „Сявенька", а дзеткі, моладзь і дарослыя прыходзілі на шматлікія музейныя мерапрыемствы, хаця б з цыкла „Культура на музейных сходах".

— Без фінансавай успамогі з дзяржаўнага бюджэту і ад самаўрадаў было б немагчыма арганізаваць мерапрыемствы, — заявіў старшыня Міраслаў Мордань, які пералічыў спонсараў музейных мерапрыемстваў, што ўспамагалі музей нават дзесяткамі тысяч злотых. Напомніў ён, што музей ужо 2 гады з'яўляецца ўласнікам музейнага ўчастка, за які мусіў заплаціць для БГКТ 250 тысяч злотых. Мяркуецца, што фінансавыя клопаты музея можна будзе абмежаваць, а можа нават пераадолець дзякуючы гатэльнай дзейнасці. Зараз у музеі 30 належных месц, сярод якіх большасць, што былі нядаўна прыстасаваныя да гэтай дзейнасці, з высокім жыллёвым стандартам. Выконваючы абавязкі дырэктара Тамаш Ціханюк сказаў, што ў першую чаргу будуць разбудоўвацца ў музеі існуючыя экспазіцыі і надалей арганізавацца культурная, а ў гэтым ліку і бібліятэчная, дзейнасць, а толькі ў далейшай будучыні прадбачваецца будаваць скансэн на музейнай плошчы.

Віктар Бура пазнаёміў прысутных з вынікамі сваёй паездкі ў Беларусь, дзе стараўся распазнаць магчымасці дапамогі для гайнаўскага музея. Паінфармаваў ён, што дырэктар Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея Юрый Кітурка абяцаў даць бясплатную дапамогу музею.

— Дырэктар гродзенскага музея заявіў, што бясплатна можна будзе аддаваць нашы экспанаты ў яго музей на рэнавацыю, а спецыялісты з музея ў Гродне могуць прыехаць у Гайнаўку і дармова даваць парады наконт музейнай дзейнасці. Намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Тадэвуш Стружэцкі таксама абяцаў дапамогу нашаму музею і апеку. Аднак у Беларусі звярталі ўвагу, што мы павінны надалей дзейнічаць як музей, — заявіў Віктар Бура, які расказаў пра заявы аб іншай дапамозе з РБ.

Выступаючыя ў час сходу найчасцей заяўлялі, што трэба карыстацца ўсялякай дапамогай як з Польшчы, так і з Беларусі. У час сходу былі выбраны 15 асоб у прэзідыум аб'яднання, якое пасля выбярэ ўправу з сямі чалавек. Толькі нававыбраная ўправа вылучыць свайго старшыню, двух яго намеснікаў і вырашыць справу выбару новага дырэктара музея, якім можа стаць таксама выконваючы яго абавязкі Тамаш Ціханюк.






## Захапленне майго жыцця

☞ 5

Міхал МІНЦЭВІЧ



Аляксандр Сасна

## Гадавіна самаўрадавай дзейнасці

☞ 9

Аляксей МАРОЗ




## ЗАПРАШЭННЕ

Аб'яднанне Бацькоў **АБ-БА**
сардэчна запрашае
**Дыскусійны клуб „АБ-БЫ"**

***Пагаворым пра ...***
**„Другая сусветная вайна — міфы і рэальнасць"**

Сустрэча
з **Юрым Туронкам**
- гісторыкам, журналістам, аўтарам гістарычных кніг.

**18.06.2010 г. 18.00**
Пачатковая школа № 4
вул. Чанстахоўская 6а/8

**Projekt realizowany dzięki dotacji Zarządu Województwa Podlaskiego**

# Флатылія папулізму



*Можа хто скажа, што няма чаго пісаць і разважаць пра чыесьці праблемы, калі сваіх вышэй галавы. Але хіба свет зараз такі, што цалкам чужых пытанняў, якія б не закранулі нас хаця б ускосна, ужо не існуе. І калі што ў свеце робіцца, нават вельмі далёка ад нас, то нейкім чынам дойдзе або дапаўзе і сюды. І як кажуць у народзе, праз нейкі бок вылезе.*

*Таму, тое што адбылося з так званай „Флатыліяй свабоды”, не такая ўжо далёкая тэма ні для беларусаў, ні для кожнага чалавека ў любым кутку нашай планеты. Таму невыпадкова, што пасля інцыдэнту, які адбыўся паміж удзельнікамі флатыліі і ізраільскімі салдатамі, не толькі ўрад Турцыі стаў пагражаць Ізраілю „непапраўнымі наступствамі”, але і генсек ААН Пан Гі Мун выступіў з публічнымі асуджэннямі, і нават Нікаля Сарказі, дзеючы прэзідэнт Францыі, пастараўся паказаць сябе так, каб ніхто больш не блытаў яго з сапраўды правымі.*

*Ізраільскія салдаты не пусцілі чужую флатылію на сваю тэрыторыю. У бойцы, якая завязалася паміж спецпадраздзяленнем і тымі, хто плыў, загінулі людзі. У бок Ізраіля пасыпаліся абвінавачванні. Лагічна паставіць два працейшыя пытанні. Першае — ці патрэбны Ізраілю гэты канфлікт? І другое — чаго шэсць караблёў прарываліся на тэрыторыю чужой краіны акурат у той час, калі Ізраіль праводзіў вайсковыя вучэнні?*

*На першае пытанне адказаць проста. Ізраіль — квітнеючая дэмакратычная краіна з усімі элементамі цывілізаванай дзяржавы. Там існуюць дэмакратычныя выбары, рэальнае раздзяленне ўлады, свабодныя суды, прававое поле, у якім не толькі свае грамадзяне, але і замежныя структуры могуць свабодна і адкрыта змагацца за справядлівасць, выкарыстоўваючы ўсе здабыткі сістэмы, арыентаванай на пошук праўды. Узровень жыцця, мякка кажучы, не самы горшы ў рэгіёне і на планеце. На адпаведным узроўні і медыцына, і адукацыя і сфера паслуг. Жыві і радуйся. Такой краіне войны, канфлікты і непаразуменні цалкам непатрэбныя. Таму лагічна меркаваць, што і інцыдэнт з флатыліяй таксама не ўваходзіў у планы развіцця міжнародных адносін гэтай дзяржавы з іншымі.*

*А куды ж ехала флатылія і што ёй было трэба? Яна накіроўвалася ў сектар Газа, якую Ізраіль лічыць базай тэрарыстаў. І везла, як сцвярджаецца, гуманітарную дапамогу. Ізраільцы папярэджвалі, што не пусцяць гэтых шасці караблёў на сваю тэрыторыю. З іх кропкі гледжання, тэрарысты — такая катэгорыя людзей, якія на дармавую ежу, вопратку і зброю прэтэндаваць не могуць, паколькі выкарыстоўваюць усё гэта дзеля знішчэння ізраільскай дзяржавы і ізраільскага народа.*

*У сектары Газа кіруе радыкальная арганізацыя ХАМАС, у планах якой чорным па белым так і запісана, што гэтая арганізацыя для таго і існуе, каб знішчыць Ізраіль. Таму (зноў жа звяртаемся да логікі) вайна ў гэтым рэгіёне непазбежная, пакуль не здарыцца адно з двух. Ці ХАМАС зыдзе з сектара Газа, ці зменіць свае планы наконт знішчэння Ізраіля. А пакуль ён гэтага не робіць, то трэба ведаць, што вайна ёсць і будзе незалежна ад таго, якую б міралюбівую ці рашучавайсковую пазіцыю не заняў Ерусалім.*

*А пачалася тая вайна зусім не на палубе „Маві Мармара” — судна „Флатыліі свабоды”. Хутчэй за ўсё распачатая яна дзеяннямі многіх еўрапейскіх крывадушных палітыкаў, якія, каб не згубіць галасоў выбаршчыкаў арабскага паходжання, гатовыя бясконца „асуджаць” рашучыя крокі Ізраіля, скіраваныя на ахову жыцця сваіх грамадзян. І зараз усе крывавыя правакацыі ў свеце робяцца тэрарыстамі з улікам таго, што ёсць у свеце палітыканы, якія шукаюць не праўды і справядлівасці, а толькі галасоў выбаршчыкаў любым коштам. І будуць яны дзеля галасоў выварочваць праўду навыварат, асуджаць і рабіць заявы, аб'ядноўшыся ўжо адзін з другім у цэлую флатылію папулізму і ілжы. А тое, да чаго давядуць такія дзеянні, іх не цікавіць. Маўляў, пасля нас, хоць патоп.*

*А як разабрацца хто вінаваты нават дзеці ведаюць. Вінаваты заўсёды той, хто першы пачаў. А першай пачала дзеіць у сектары Газа не „Флатылія свабоды”, і нават не ХАМАС, а вось гэтая флатылія папулізму і ілжы.*

**Віктар САЗОНАЎ**

# Вуліца Янкі Брыля ў Гдыні



Справа: Сцяпан Свідэрскі, Аляксандр Юзэфовіч, Лена Глагоўская, Анна Мекін, Павел Аўласюк і Міхась Куптэль

*Калі на карце горада знаходзім вуліцу, то гэта яшчэ не абазначае, што можна яе знайсці ў рэчаіснасці. У раёне, ці больш дакладна кажучы, у межах горада Гдыні знаходзіцца тэрыторыя, якая зусім не нагадвае горада: нейкія сцяжынкі і палявыя дарогі сярод жытніх і бульбяных палеткаў. Да таго вуліца Сьліская, якая ўецца не толькі сярод палёў, але і ляснога, балоцістага пасля апошніх дажджлівых майскіх дзён бездарожжа. Вуліца Сьліская мела давесці нас да вуліцы Янкі Брыля.*

*У гэтым годзе старшыня Беларускага культурнага таварыства „Хатка” Лена Глагоўская падкінула пад развагу членам галоўнага праўлення думку знайсці вуліцу Янкі Брыля ў Гдыні — у сэнсе яе тэрытарыяльнага распалажэння.*

*Адкуль вуліца ў Гдыні атрымала імя беларускага пісьменніка Янкі Брыля? Як кажуць дзе: Рым, а дзе Крым. Аказваецца, што не так далёка. Улада наскрозь польскага горада вырашае, што патронам вуліцы будзе беларус, няхай сабе і слаўны пісьменнік. Гэта не здараецца так сабе. Відавочна, аргументы былі вельмі моцныя, калі пераканалі да гэтага прэзідэнта Гдыні і Гарадскую раду ў 2009 г.*

*З ініцыятывай увекавечання памяці Янкі Брыля ў Гдыні, прынамсі назвай вуліцы, выйшла наша старшыня, даследчыца слядоў беларускасці на Памор'і і ў іншых рэгіёнах Польшчы. Падрыхтавала яна таксама поўнае абгрунтаванне сваёй прапановы для ўлады (гл.: „Zeszyty Gdyńskie” 2009, № 4, с. 195-211), так што іншага выхаду ўлада не мела як толькі назваць вельмі прыгожую вуліцу ў раёне Хважно — Сокулка ў Гдыні.*

*Кім быў Янка Брыль, чытачам „Нівы” прыпамінаць не буду, але варта працытаваць абгрунтаванне Лены Глагоўскай:*

*„W marcu 1939 r. powołano go [Янку Брыля — М. К.] do służby wojskowej w piechocie morskiej w Gdyni. Znalazł się w szkole podoficerskiej, która mieściła się niedaleko koszar, nad morzem, w domu wypoczynkowym pracowników Narodowego Banku Polskiego w Orłowie. W latach 90. wspominał o tym w lirycznych wspomnieniach i miniaturach: „Школа была размешчана воддаль ад казармаў, зусім над морам, у раскошным доме адпачынку работнікаў Польскага дзяржаўнага банка, бо дом гэты стаяў пусты, як і ўсе іншыя дамы адпачынку, санаторыі, вілы багатых, з палавіны жніўня апусцелыя ў змрочным чаканні боскае літасці перад зусім-зусім набліжанай вайной” (Я. Брыль, Вячэрняе. Лірычныя запісы і мініяцюры, Мінск 1994, с. 254).*

*Далей Л. Глагоўская піша:*

*„Pierwsze spotkanie z Gdynią wywarło na nim niezapomniane wrażenie. W powojennej twórczości wielokrotnie powracał do opisów miasta i jego obrony we wrześniu 1939 r. W Polsce ukazało się też wiele przekładów jego utworów, w tym opisujących Gdynię w 1939 r. Od 1955 r. wielokrotnie bywając w Polsce udzielał wywiadów prasowych, w których przewijał się wątek września 1939 r.”*

*«У марской пяхоце, як і ва ўсіх іншых часцях, што размяшчаліся ля заходняй граніцы Польшчы, беларусаў служыла шмат — туды іх, па плану адпаведнай растасоўкі, бралі як найбольш: найдалей ад Саветаў. Народ цягавіты і смелы, яны не агіналіся і на вайне — пакуль стаялася, стаялі добра, не горш, а то і лепш за другіх палякаў (Я. Брыль, Птушкі і гнёзды, Мінск 2006, с. 57-59).*

*Усе цытаты з матэрыялаў Л. Глагоўскай.*

*Думка старшыні БКТ „Хатка” ішла далей, чым знайсці вуліцу Янкі Брыля ў Гдыні: знайсці вуліцу так, але і знайсці месца, нейкую невялічкую плошчу, каб паставіць камень з мемарыяльнай дошкай і інфамацыяй для жыхароў гэтай часткі горада кім быў патрон вуліцы. Нагодай для, як не кажы, патрыятычнай вандроўкі ў пошуках вуліцы Янкі Брыля і адпаведнага месца пад помнік, як штогод, было каталіцкае свята Божэ цяло і чатырохдзённы ўік-энд. Пішу «штогод», бо фактычна беларусы Памор'я традыцыйна ў гэты святочны дзень вандруюць ці то дзеля інтэграцыі беларускага грамадства, ці то дзеля вясенняга адпачынку. Ахвотных да вандроўкі адпалохваў прагучаўшы па тэлебачанні прагноз пра зімняе і дажджлівае надвор'е. Маё аптымістычнае перакананне, што надвор'е, як штогод, будзе якраз для нас ласкавае, аказалася праўдай. І хто прыбыў на зборны пункт, той пакарыстаўся сонечным надвор'ем, карыснай вандроўкай, адпачынкам і каўбаскамі пры вогнішчы.*

*Спатыкаемся зноў за год. Жыве Беларусь!*

**Міхась КУПТЭЛЬ**

**Вачыма еўрапейца**

# IKEA з Грынпіс



*Мы павінны ахоўваць гэтую пушчу як наш пасаг у Еўрапейскай Супольнасці, павінны зрабіць усё, каб не дазволіць высякаць старыя дрэвы. Я ў гэтым глыбока перакананы, аб'ядноўваюся з многімі людзьмі, якім менавіта залежыць на ахове прыроды, — пры дапамозе такіх слоў польскага лаўрэата Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры Чэслава Мілаша міжнародная грамадская прыродаахоўная арганізацыя Грынпіс змагаецца супраць распродажу Белавежскай пушчы. У мінулым месяцы яе дзеячы апублікавалі спецыяльны рапарт аб пагрозах, якія нясе — як адзначана — „драпежніцкая высечка дрэў на тэрыторыі апошняга натуральнага лесу Еўрапейскай нізіны”. Аўтары рапарта сцвярджаюць: „Навукоўцы папярэджваюць, што аховы лапікаў пушчы недастаткова каб захаваць яе ўнікальны характар і гарантаваць безупыннасць экалагічных працэсаў”. Напамінаюць, што празмерная эксплуатацыя натуральных пушчанскіх дрэвастояў, якія знаходзіцца па-за ахоўнай зонай, ужо давяла да таго, што Белавежскаму нацыянальнаму парку адабралі прэстыжны дыплом Рады Еўропы, якім узнагароджваецца ахоўваныя абшары. Адказнасць за „паступовы распродаж нашай спадчыны” (знішчэнне ахоўваных відаў фаўны і флоры, а таксама іх біятопа) ускладаюць на Рэгіянальную дырэкцыю Дзяржаўных лясоў у Беластоку, якая распараджаецца 80% паверхні Белавежскай пушчы. На іх думку, пушчу „перарабляюць на апал, дошкі, мэблю і запалкі”. Таму Грынпіс заклікае дрэваапрацоўчыя фірмы ўвесці забарону купляць драўніну з Белавежскай пушчы.*

*Першай адрэагавала нарвежская фірма IKEA, якая намерваецца пабудаваць свой завод у ваколіцах Орлі. Дырэктар польскага аддзялення Грынпіс Роберт Цыгліцкі ў разасланым да СМІ, у тым ліку і ў „Ніву”, камюніке не скрывае задавальнення: „Рэакцыя фірмы IKEA — добры прыклад грамадскай адказнасці бізнесу. Падобныя гарантыі атрымалі мы ад іншых важных прадпрыемстваў на польскім драўнінным рынку. Чакаем, аднак, што будзе гэта безагаворачная дэкларацыя спынення ўдзелу ў высечцы пушчы ў рамках сістэмы кантролю паходжання драўніны”.*

*Здаецца мне, што канчатковай мэтай Грынпісу з'яўляецца пашырэнне ахоўванага абшару на ўсю Белавежскую пушчу. Аднак да гэтага адмоўна ставіцца мясцовае грамадства, якое баіцца, што будзе пазбаўлена дрэва на апал, а мясцовая дрэваапрацоўчая прамысловасць страціць сыравінную базу. Грынпіс тлумачыць: „Як сведчыць аналіз афіцыйных дакументаў, большасць пушчанскай драўніны трапляе па-за Гайнаўскі павет. Сярэдні рознічны продаж у трох пушчанскіх надлясніцтвах у 2008-2009 гадах склаў каля 29 тысяч кубаметраў у год. Больш таго, лакальнае выкарыстанне драўніны зніжаецца. Дзяржаўныя лясы арыентуюцца на здабыванне больш вартаснай драўніны для вялікіх камерцыйных пакупнікоў. Рознічны апал для іх — пабочны прадукт”.*

*У рапарце можна прачытаць: „У адпаведнасці з планам добраўпарадкавання лесу ад 2003 года, да 2011 года можна здабываць у пушчы да 150 тысяч кубаметраў у год. Актуальны попыт лакальных грамадскасцей на дрэва вагаецца ў межах ад 30 да 40 тысяч кубаметраў”. І далей эколагі ацэньваюць: „Усё, што акажацца вышэй гэтай мяжы, будзе працягам распродажу нашай спадчыны”. І, пэўна, так можа быць. Але ці абавязкова? Рашэнне фірмы IKEA паказвае, што не.*

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

# Каб толькі хацелася!

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК



## Бацькі

— Цешымся вельмі моцна, што ў гэтым годзе нашы дзеці пачалі спяваць у гэтай групе, — прызнае мама Габрыся Скаўронскага (яна ў ролі маці і новага сакратара Аб’яднання АБ-БА). — Габрысь пацягнуў за сабой малодшую сястру Юльку, якая яшчэ не вучылася беларускай мове, але ідзе ў гімназію і будзе з іншымі яе вывучаць. А наймалодшая дачка толькі глядзіць на гэта ўсё і пытае: „А калі я змагу так спяваць?”

— Мой сын за гэты год стаў больш упэўненым, а я ўпэўнена, што гэта дзякуючы працы ў тэатральным гуртку, — ганарыцца маці Томка Мусько. — Яго належным чынам ацанілі ў конкурсе. Я бачыла як кожны выступ ён перажывае, як рыхтуецца, хвалюецца, а пасля як гэта ўзмацніла яго асобу. Гэта прынясе безумоўна карысці ў будучыні.

— Такія нагоды нам патрэбныя, каб часам адпаведна ацаніць сваё дзіця, — кажа бацька Нінкі Ваўранюк. — Мы нават не падазраваем, што нашы дзеці такія таленавітыя. Штодзень не маем магчымасці за гэтым сачыць, бо ўвесь час спяшаемся, бяжым, а пры такіх нагодах адкрываем таленты, якія часта дзеці развівалі ў таямніцы. І вось тут усё гэта можам пабачыць.

## Дзеці

— Доўга яшчэ да пачатку?

— Яшчэ паўгадзіны.

— Так доўга? А можам ужо апрануць касцюмы?

— Будзе вам вельмі горача.

— Але можам, можам?

— Можаце.

Дзеці пайшлі апранацца, а зала Ваяводскага асяродка анімацыі культуры, дзе ў мінулую пятніцу вынікі ў галіне беларускай адукацыі ў Беластоку за апошні школьны год супольна падводзілі дзеці, бацькі і настаўнікі, пачала запаўняцца публікай. Цэлую сустрэчу ўпершыню вялі вучні, на гэты раз Магда Саковіч, Кася Бялькевіч і Дар’я Вапа, сёлетнія выпускніцы ўсіх школ, у якіх вядзецца навучанне беларускай мовы. У час прэзентацый на сцэне можна было перш за ўсё пабачыць тры спектаклі, якія падрыхтавалі малышы ў розным узросце, а таксама паслухаць песень розных нацый і розных стагоддзяў, з перавагай, зразумела, беларускіх. Нарэшце ў рукі сабраных трапіў таксама альбом „Васількі, валошкі”, які Аб’яднанне АБ-БА падрыхтавала да юбілею 85-годдзя Віктара Шведа.

## Бацькі

— Гэта патрэбна нам і нашым дзецям, але вядома, што на працягу года не маем шансу сустрэцца, пагаварыць, абмяняцца пагдядамі і вопытам. А тут ёсць месца, каб паціснуць руку, прывітацца, нават паўспамінаць старыя студэнцкія часы. Сёння яшчэ адчувала я матылькі ў страўніку, калі бачыла свайго сына на сцэне. Прызнаю, што былі моманты ў гэтым годзе, калі ён разважаў ці надалей яму вывучаць беларускую мову, але ўсё ж такі перадолеў усе сумненні, — мама Томка.

— Спявалі цудоўна, таксама мне вельмі падабаліся ў спектаклі, у якім разам выступалі, — мама Ганкі і Лідкі.

— Нават адзін сказ на сцэне ў вуснах нашага дзіцяці хвалюе і захапляе, — мама Шымона.

— Цудоўна бачыць сваіх дзяцей на сцэне, тым больш, што ўсё на нашай роднай мове, а гэта патрэбнае, і ўрокі, і гурткі, і хронікі, і экскурсіі, — бацькі Габрыся і Юлькі.

— Мы патрабуем тут быць супольна, бо тады відаць, што ёсць бацькі, якім яшчэ хочацца. Тут трэба прысвяціць свой свабодны час, аддаць частку яго супольнай справе. За намі чарговы, паспяховы год, — завяршае старшыня АБ-БЫ Барбара Пякарская.









## Дзеці

Дзеля гэтага выступу працавалі цэлы год. Пачаткова, як кажа назва заняткаў, была гэта „Гульня ў тэатр”. Раз гулялі па-дзіцячаму, іншым разам — як сапраўдныя акцёры. Калі выходзілі на сцэну, а было гэта двойчы ў гэтым годзе, адчувалася павагу і ангажаванасць. Быў і такі дарослы стрэс, а як жа, бо дзеці з’яўляюцца маленькімі копіямі сваіх бацькоў. Любяць выконваць час ад часу ролю дарослых. У тэатр гулялі вучні з нулявога класа па першы клас ліцэя. Вядома, у кожнай групы іншы вопыт. Некаторыя станавіліся акцёрамі ўпершыню, іншыя ўжо лічаць сябе ветэранамі, але ўсе так сама перажываюць і турбуюцца за поспех, асабліва перад бацькамі. У такі ўрачысты дзень, хаця не змагаюцца за ўзнагароды, а толькі, а можа аж, за прызнанне бацькоў і публікі, якія сабраліся паглядзець вынікі працы сваіх дзяцей.

## Хроніка

Аб’яднанне АБ-БА вядзе сваю хроніку падзей. Не забракне ў ёй справаздачы з чарговага завяршэння года. Але хроніка запісвае таксама іншыя падзеі. З гэтага года стала яна між іншым хронікай хронік.

Вучні апошняга класа падставовай школы і гімназісты пачалі ў гэтым годзе новы праект „Падляшскія хронікі”. Гэта чарговы крок пасля беларуска-літоўскіх сустрэч у рамках ідэйнага праекта „Вялікае Княства Літоўскае — наша супольная спадчына”. „Падляшскія хронікі” — гэта карта сямейных успамінаў, якія стануць указальнікам на будучыню. Праект спалучае ідэю пазнавання сваёй маленькай гісторыі, якая змяшчаецца на фоне іншых культур і агульнагістарычных падзей. Таму ў гэтым годзе сапраўдны фінал беларускага школьнага года толькі што наперадзе, менавіта перад круглай гадавінай бітвы пад Грунвальдам. Дзеля гэтага выступу малыя ўдзельнікі праекта, супольна з моладдзю з Белавежы, удзельнічалі ў майстар-класах з гуртом „Стары Ольса”. Уяўлялі сабе як ішоў з ваярамі князь Вітаўт, як гулялі ў корчмах, як танцавалі. Усё гэта запрэзентуюць 11 ліпеня ў скансэне „Беластоцкі музей вёскі”.

## Выпускнікі

Няма завяршэння школьнага года без развітання з выпускнікамі паасобных школ. Такім чынам на сцэне ў „Сподках” апынуліся выпускнікі Пачатковай школы № 4, гімназіі № 7 і ліцэя № 3 у Беластоку — школ, у якіх вядзецца навучанне беларускай мовы. Урачысты характар гэтаму развітанню забяспечылі не толькі прыгожыя сукенкі і спадніцы, але таксама падарункі. Не шкадавалі сувеніраў на развітанне Культурны цэнтр Беларусі ў Беластоку, беларускае Радыё Рацыя і, зразумела, Аб’яднанне АБ-БА. Аднак толькі з чатырма асобамі развітваліся ўсе апошні раз, з беларускімі матурыстамі: Магдай Саковіч, Оляй Максімюк, Ізай Нічыпарук і Юстынай Смольскай, перад якімі зараз этап вышэйшай адукацыі. Цёплыя словы ў іх бок накіравала ад імя сабраных Барбара Пякарская:

— Найважнейшае, каб вы неслі праз жыццё тое, што атрымалі на працягу гэтых гадоў адукацыі і не забывалі пра сваё. Каб ведалі, што іншы не абазначае горшы. Наша іншасць можа быць цікавая і ў жыцці можа вам сапраўды дапамагчы.

## Песні і васількі

Спяваць можа кожны, але каб добра спяваць, трэба шмат папрацаваць. Наймалодшыя працавалі пад вокам Алы Каменскай, а старэйшыя вывучалі песні на чарговых майстар-класах, якія дзякуючы гасціннасці Дануты Курань (якой моладзь на сцэне аддзячыла, даруючы беларускі бел-чырвона-белы сцяг) і Усеагульнага ўніверсітэта ў Тэрэміскіх там жа праходзілі. Пра розныя з’явы і пачуцці спявалі ўдзельнікі музычнага кола. Яны таксама рыхтавалі песні на словы Віктара Шведа, якія ўвайшлі ў альбом „Васількі, валошкі”. Старэйшая моладзь прэзентавала песні з рэпертуару рыхтаванага пад Грунвальд, песні засвоеныя ў час сутсрэч у Тэрэміскіх, а таксама падрыхтавалі неспадзяванку сваім бацькам: выканалі дзве песні на словы Сержука Сокалава-Воюша пад акампанемент Альжбеты Бэзюк, удзельніцы беларускіх рэйдаў у 1980-х гадах і тагачаснай падляшскай бардэсы. Слёзы некаторым закруціліся. Працяг супольных спеваў перанёсся ў залу з пачастункам, дзе бязмежна разліліся ўсе эмоцыі. Узаемныя віншаванні, падзякі, а нават ацэнкі:

— Безумоўна ставім шасцёрку за гэтую круглагадовую працу, — падвёў сустрэчу Яраслаў Малэцкі — прадстаўнік Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, якое фінансуе шмат праектаў. — Аграмадная праца, вялікая ангажаванасць малых акцёраў, выканаўцаў, таксама ангажаванасць усіх настаўнікаў і інструктараў. Гэта вялікая справа для дзяцей так з беларускай меншасці, як і іншых, якія сёння былі прысутныя. Тым першым патрэбна гэта для захавання тоеснасці, другім — для пазнання культуры сваіх калег з панадворка ці з-за школьнай парты.

## Аўтарская сустрэча

15 траўня Гмінная бібліятэка ў Чаромсе з нагоды Дня прэсы, кніжкі і друку арганізавала ў асяродку культуры аўтарскую сустрэчу з Веславам Разбіцкім. Пісьменнік нарадзіўся ў Чаромсе, тут правёў дзяцінства, здабыў пачатковую адукацыю ў мясцовай сямікласнай школе. Пасля вучыўся ў агульнаадукацыйным ліцэі імя М. Кюры-Складоўскай у Гайнаўцы і ў 1963 годзе атрымаў атэстат сталасці. Падляшша пакінуў сорак гадоў таму. Пражываў у Слупску і Быдгашчы. Закончыў Афіцэрскую школу танкавых войск у Познані. Зараз ён — мешчанін, як сам сябе называе, і жыве ў сталіцы. Шмат гадоў працаваў журналістам вайсковай прэсы і радыёвяшчання. Узначальваў вайсковую кінастудыю „Czołówka". Працаваў прэс-сакратаром міністра нацыянальнай абароны. З'яўляецца членам Саюза польскіх літаратараў. У большасці твораў вайсковец Разбіцкі апісвае здарэнні з салдацкага жыцця, напрыклад, „Anegdoty i płoty o generałach", „Podchorąży zawsze zdąży", „Mam was wszystkich w d..." і „Żurawiejka". Гэтую апошнюю кніжачку аўтар прысвяціў чарамшанам (пісаў я аб ёй у 28 нумары „Нівы" ад 9 ліпеня 2000 г.).



Фота Уладзіміра СІДАРУКА

У час сустрэчы аўдыторыя была невялікая. У асноўным зводзілася да сяброў са школьных гадоў і дзіцячых гульняў аўтара. З сямідесяцігодкаў, якія крыху памятаюць мінулыя будні Чаромхі-Станцыі, было нас трое: Міхалай Раманчук с. Рыгора, Васіль Баранаў і ніжэйпадпісаны. З уступным словам выступіла загадчыца мясцовай бібліятэкі Тамара Кердалевіч, якая пазнаёміла ўдзельнікаў з творчасцю пісьменніка. Больш падрабязнасцей даведаліся мы ад самога Веслава Разбіцкага. Весек, як яго на сустрэчы клікалі сябры, найбольш фактаў паказваў са сваіх школьных гадоў і дзіцячых гульняў, чым з гісторыі пасёлка. Праўда, намагаецца ён папаўняць даныя дакументамі і фотаздымкамі, якія збірае ўсімі даступнымі яму сродкамі. Нават цяпер, карыстаючыся нагодай, заклікаў перадаваць яму матэрыялы, якія абяцае выкарыстаць у наступнай кніжцы. А „Журавейку" я паўторна прачытаў і не зусім здаецца быць мне зразумелым, чаму аўтар пазбягаў аўтэнтычных герояў, а называў іх чужымі імёнамі. Мне здаецца, што намнога цікавей было б паказаць даўнейшую Чаромху ў мясцовым каларыце, чым упрыгожваць паэтычнымі эпітэтамі і чужамоўнай гаворкай, якой тутэйшыя не карыстаюцца. Мясцоваму жыхару кніжка напамінае больш літаратурны твор па вобразу і падабенству вёскі з „крэсаў", чым аўтэнтычную Чаромху шасцідзесятых гадоў (бо таго перыяду кніжка тычыцца ). Агульна можна сказаць, што напісана яна цікава і чытаецца добра. Аднак хацелася б пажадаць аўтару, каб пазбягаў такіх недакладнасцей як у „Журавейцы", бо яны адмоўна ўспрымаюцца мясцовымі чытачамі.

**Уладзімір СІДАРУК**



Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

# Гарадоцкае святкаванне

**Ужо традыцыйна шэсцем прадстаўнікоў жыхароў і ўлад з-пад будынка Гміннай управы да амфітэатра над вадасховішчам у Зарэчанах пачалося сёлетняе Свята Гарадка. Апрача выступленняў шэрагу калектываў можна было захапляцца паказам рыцарскіх сутычак, а функцыянеры Памежнай аховы тлумачылі чым пагражае нелегальнае перасячэнне дзяржаўнай мяжы. Адбыўся таксама матч мясцовай футбольнай каманды з камандай з Кляшчэль і ў той самы дзень завершаны быў І Рэйд аўтамашын-усюдыходаў „Усходняе бездарожжа", сарганізаваны любіцелем матарызацыі і лідарам гарадоцкага рок-гурту „РІМА" Андрэем Паплаўскім.**

Жыхары Гарадка (найвялікшай па абшары гміны ў Польшчы) пачалі збірацца пад Гміннай управай ужо паўгадзіны да маршу над заліў у Зарэчанах. Першымі паявіліся тут дзеці і выхавацелі мясцовага дзіцячага садка, з каляровымі шарамі. Усе хацелі святкаваць 512 гадавіну сваёй мясцовасці, аднаго з найстарэйшых цэнтраў асадніцтва на тэрыторыі Беласточчыны, ужо ў раннім сярэднявеччы важнага града на шляху Вільня — Гродна — Бельск — Драгічын — Сандомір — Кракаў. Пасля таго як уехаць у Гарадок відаць простым вокам, што мясцовыя маюць што святкаваць. У сярэдзіне Гміннага цэнтра культуры нават у святочную суботу (12 чэрвеня) рамонт ішоў поўным ходам, а аб адноўленым вонкавым фасадзе прыгадвае табліца, што ўдалося гэта дзякуючы сродкам з праграмы „Развіццё інфраструктуры культуры" Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны. Як сказаў нам дырэктар ГЦК Юрка Хмялеўскі, рамонт вонкавай часткі будыніны паглынуў каля 700 тыс. злотых, а цяпер поўны абмен электрычнага абстялявання, мантаж кандыцыянераў, абнаўленне сцен, падлог і г.д. будзе каштаваць 1,3 млн. злотых.

— Плануем заканчэнне гэтай часткі рамонту на кастрычнік. Удаецца нам рамантаваць сярэдзіну цэнтра дзякуючы сродкам, якія войт здабыў у Маршалкоўскай управе з Праграмы развіцця вясковых абшараў.

Непадалёк ГЦК і ГУ кідаецца ў вочы іншая табліца, аб перабудове Міхалоўскай вуліцы. У сваю чаргу аб'явы на інфармацыйнай табліцы Гміннай управы заахвочваць да ўдзелу ў неўзабаве завяршаючымся конкурсе на найбольш акуратны падворак. Амаль дакладна ў 13.30, у суправаджэнні пары паліцыянтаў на матацыклах, маршыруючыя рушылі ў бок гарадоцкага возера. Ход ачольвалі тамбурмаёркі і моладзевы духавы аркестр з Васількава пад кіраўніцтвам Адама Ліпніцкага. Праз паўгадзіны ўсе дайшлі над заліў, па дарозе шчыльна запоўненай шматлікімі мясовымі і прыезджымі — што відаць было па рэгістрацыйных табліцах аўто — назіральнікамі. Сабраных прывітаў галоўны арганізатар свята, дырэктар Хмялеўскі:

— Свята гэта ўжо традыцыя Гарадка. Першае праводзілася ў 1998 годзе, з нагоды паўтысячагоддзя Гарадка.

У час выступленняў не магло не хапіць такіх калектываў, як фальклорныя гарадоцкія „Асенні ліст", „Рассяваны Гарадок" ці славутая сваім моцным ударам „РІМА", былі і „Каліна" ды „Калінка" з Залук ды „Нараўчанкі" з Нараўкі. Адкрылі свята супольна войт Веслаў Кулеша і старшыня Гміннай рады Вячаслаў Госцік..

— Гэтае свята з'яўляецца праявай нашай багатай гісторыі і лакальнай інтэграцыі нашай гміны, — прамаўляў войт Кулеша і выказаў падзяку за асаблівую грамадскую і культурную актыўнасць старэйшым жыхарам гміны і моладзі, аб якой сказаў:

— Наша моладзь часта займае першыя месцы ў рознага тыпу змаганнях не толькі ў краіне, але і ў міжнародных. Можна назваць вас амбасадарамі Гарадоцкай гміны.

Пасля, амаль у выбарчым тоне, распавядаў аб поспехах гміны, асабліва ў інвестыцыях, якія былі і ёсць магчымымі дзякуючы здабыванні г.зв. вонкавых сродкаў. Відаць гэта, скажам, па рамантаванай дарозе перад паваротам у Гарадок з боку Беластока.

— Можам гаварыць пра стопрацэнтную паспяховасць калі гаворка аб выніковасці рэалізацыі нашых мерапрыемстваў, — войт у гэтым упэўнены.

Прадбачыў м.інш. узнікненне новых адрэзкаў дарог, сапраўднага пляжа, пляцу гульняў і веласіпеднай сцежкі над вадасховішчам у Зарэчанах, каналізацыі ў Валілах-Станцыі і „сапраўднага" амфітэатра ва ўрочышчы Барык, дзе праводзіцца фестываль музыкі маладой Беларусі „Басовішча". Пасля ў размове з журналістамі войт сказаў:

— Няма такой ініцыятывы жыхароў, каб змяніць статус Гарадка з вясковага на гарадскі. Можа схочуць, каб так сталася, калі паправіцца эстэтыка Гарадка.

Сярод выступаючых на свяце не хапіла чаканага ансамбля „Бераставіцкія музыкі". Юрка Хмялеўскі патлумачыў:

— Мы запрасілі гэты ансамбль, паколькі Гарадоцкая гміна мае падпісаную дамову аб супрацоўніцтве з Бераставіцкім раёнам. На жаль, у членаў гэтага ансамбля былі пашпартна-візавыя праблемы.

Затое паявіўся неадменны гарадзенскі бард Віктар Шалкевіч:

— Першы раз пабачыў я Гарадок, калі больш за дваццаць гадоў таму прыехаў на першае „Басовішча". Памятаю дагэтуль, як у гарадоцкім бары „Кілер" налівалі нам дармовую гарэлку, а барменка ганарылася тым, што якраз слухала адну з нашых першых кружэлак, — прыгадваў „Ніве". Пры нагодзе пахваліўся выдадзенай на ягонае леташняе пяцідзесяцігоддзе кніжкай „Правінцыя" ды планаваным на восень „Рэквіемам па непатрэбных рэчах". Кніга пакажацца ў адным з мінскіх выдавецтваў:

— Гэта апісанне 21 непатрэбнай рэчы, якія мне цяжка несці праз жыццё, ды цяжка з імі расстацца — такімі як плюшавы мішка, які гадамі сядзіць на адной з шафаў у маім доме.

Сярод святкуючых прыкмеціў мы паэта, пражываючага ў Валілах-Станцыі, раней жыхара Мастаўлян, а народжанага ў 1927 г. у Страшаве — Анатоля Парэмбскага. Дзякуючы Гміннаму цэнтру культуры ў Гарадку выдадзены быў ягоны другі том вершаў „Тут былі і будзем" пад рэдакцыяй Міры Лукшы. У размове з „Нівай" і Радыё Рацыя паэт прызнаваўся:

— У вершах лепш выкажаш тое, што табе баліць, чым у прозе. Апісваю тое, што засталося ў маёй памяці. Перажыў я цікавы час ды не заўсёды быў ён добры. Няма ў мяне прэтэнзій да людзей, а да чарговых улад, хоць улада гэта таксама людзі. Супраць палякаў нічога не магу сказаць, але ў адносінах да беларусаў улада была і ёсць подлая.

Успомніў Кастуся Каліноўскага:

— Нічога добрага ў нас пра яго не гаварылася. Казалі, што гэта бандыт. Сёння гэта вялікі герой беларусаў. Ды чаму?

На пытанне чаму, на яго думку, тутэйшыя беларусы пачалі паланізавацца, сказаў:

— Паланізацыя пачалася, бо пасля вайны не было беларускіх школ. Цяпер, калі Польшча ўступіла ў ЕС, маем трохі лепш. Дурнотай з'яўляецца паняцце падвойнай нацыянальнасці. Пры камуне існавала паняцце інтэрнацыяналізацыі і гаворка сёння аб тым, што ў кагосьці падвойная нацыянальнасць, мне прыгадвае трохі тое паняцце. У гэты раз гэта вынік глабалізацыі. У Гарадку маладыя мала трымаюцца беларушчыны, не гавораць ужо па-свойму.

Свята Гарадка працягвалася да позняй ночы пры акампанеменце гурту „Сэрвіс". Гулялі пры песеньках Госі Анджаевіч, якая некалькі гадоў таму стартавала ў папярэдніх элімінацыях у Беларусі да конкурсу Еўрабачання. Чаму якраз яна і калектыў „Аніма" былі зоркамі мерапрыемства? Юрка Хмялеўскі тлумачыў коратка: „Бо такое ёсць запатрабаванне".

Сама спявачка не скрывала пасля канцэрта, што была пад агромным уражаннем прыёму, які падрыхтавала ёй тлумна сабраная гарадоцкая публіка; такіх тлумаў у гэтым месцы яна не спадзявалася!

# Захапленне майго жыцця

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

**14 мая ў арлянскім Комплексе школ адбылася сустрэча са спадаром Аляксандрам Сасной. З'явіўся ён у Орлю не ў ролі намесніка прэзідэнта Беластока, але ў ролі збіральніка даўніх паштовак з царкоўнымі сюжэтамі. Першапачаткова сустрэча мела адбыцца 16 красавіка, але з-за нацыянальнай жалобы была тады адтэрмінавана. На сустрэчу — у неспрыяльнае дажджлівае надвор'е — з'явілася некалькі дзесяткаў зацікаўленых арлян у розным узроставым дыяпазоне. На насценных зашклёных стэндах была частка арыгінальных паштовак, але галоўная прэзентацыя адбылася на вялікім экране з дапамогай праектара і камп'ютара. Збіральнік гаварыў пра змест паасобных карцінак, пра спосабы іх здабывання, часам даволі неспадзяваныя. Прадстаўленых на паштоўках большасці цэркваў ужо няма і часта адзіным следам ад іх з'яўляюцца менавіта гэтыя захаваныя карцінкі.**





Дырэктар Комплексу школ Дарыюш Гарадзецкі прадставіў госця радавітым арлянінам, а спадар Сасна павёў далейшы расказ:

Я сапраўды нарадзіўся ў Орлі 21 верасня 1963 года, у будынку, які яшчэ стаіць [цяпер у ім Асяродак здароўя — М. М.]. Я цікавіўся, чаму я нарадзіўся ў Орлі, калі сястра нарадзілася ў Белай-Падляшскай, а бацька быў на прыходзе ў Кодані, што над Бугам. Дзядзька патлумачыў гэта так: „Хацелі хрысціны на наш кошт зрабіць, таму прыехалі ў Орлю". Пасля дзедка заказаў з Бельска таксі маркі «Победа» і мяне маленькага завезлі ў Кодань.

Сустрэліся мы дзеля таго, каб паразмаўляць пра паштоўкі, якія я называю захапленнем майго жыцця. Адны збіраюць банкаўскія купюры, іншыя збіраюць маркі. Я гавару, што манета не дае такой калекцыянерскай прыемнасці, што яна халодная. І калі яе ўзяць у руку і адціснуць на ёй папілярныя лініі, то яна траціць вартасць, бо яна ўжо не ў банкаўскім стане, толькі ўжо скарыстаная, яе вартасць падае. А паштоўка заўсёды цёплая і кожны раз — хаця я свае паштоўкі ведаю — калі пераглядаю іх, знаходжу нейкую новую дэталь. Найважнейшае ж тое, што гэтае захапленне ніколі не канчаецца, бо паштовак столькі, што не ведаю ці хопіць мне жыцця каб іх усіх сабраць. Калі я пачынаў імі займацца, то думаў, што ўдасца...

Да Першай сусветнай вайны было ў Польшчы паўтары тысячы цэркваў, зараз асталося паўтысячы. Дзе былі разбураны, дзе панішчаны, дзе знесены, дзе заменены на касцёлы. А я ўсё збіраю і ўвесь час бачу, што гэтае захапленне не канчаецца, бо знаходжу ўсё новыя паштоўкі ў шторах іншых месцах, здабываю іх рознымі спосабамі. Уявіце сабе, што ў час Першай сусветнай вайны (а я збіраю паштоўкі, выпушчаныя толькі да 1945 года), калі сюды прыйшлі немцы, то заўсёды за перадавой ішлі фатографы і яны рабілі здымкі. Бо ў ходзе вайны салдаты пасылалі дадому пісьмы са здымкамі і такую паштоўку-здымак нехта схаваў дома як найдаражэйшы скарб; і гэта ляжала доўга. Нямецкая франтавая пошта была завалена паштоўкамі, бо друкарні друкавалі тады дзевяць мільёнаў паштовак у месяц і яны ўсё ёсць. Калі паехаць у Германію на біржу, то там каля двухсот экспанентаў прапануюць каля мільёна старых паштовак. І калі ўзяць такую каробку, у якой адна іх тысяча, то пасля агляду пяці тысяч вочы знясільваюцца, а рукі чарнеюць ад тушы. І чалавек хацеў бы яшчэ глядзець, але ў чатыры гадзіны вечара мерапрыемства канчаецца.

Чаму я стаў збіраць паштоўкі — не ведаю, чалавек пачынае збіраць... Нешта хочам пасля сябе пакінуць. Адны пакідаюць вялікія дамы. Тут, у Орлі, быў калісь вялікі замак [Радзівілаў з 1622 года — М. М.], дзе ён? Няма яго. А кажуць: што напішаш пяром — не вырубіш тапаром. Гэтаксама і з паштоўкамі: ім сама менш восемдзесят гадоў, ніхто ім не замінаў, нехта іх перахоўваў і цяпер яны тут.

Таму я прапаную, каб вы, у час доўгіх зімовых ці асенніх вечароў — замест аглядаць тэлесерыялы — узялі ўсе вашы здымкі і на адвароце напісалі, хто на іх паказаны. Бо адразу ўсе памятаюць хто там, але пасля пяці гадоў не надта, а калі дзедкаў не будзе зусім, то не будзем памятаць, хто на здымках.

Я пачаў збіраць паштоўкі з нейкай генетычнай наканаванасцю. Тата з мамай кніжкі пішуць, а мне найлягчэй збіраць паштоўкі. Найпершай была паштоўка з вроцлаўскай царквой, а з часам тая калекцыя вырасла да двух тысяч штук. Паштоўкі па-рознаму каштуюць: ад аднаго да 160 еўра. Ёсць многа калекцыянерскіх аб'ектаў, але толькі збіральнікі паштовак абменьваюцца паштоўка за паштоўку, штука за штуку. Манет, напрыклад, так не абменьваюць. Толькі філакартысты — збіральнікі паштовак — з'яўляюцца такімі шчырымі, адкрытымі. І паштоўкі, якія я збіраю, маюць для мяне неацэнную вартасць. У інтэрнэце маю сайт, на якім прэзентую каля тысячы двухсот паштовак, якія кожны можа пабачыць. Нехта выдае кніжку пра нейкую мясцовасць і звяртаецца з просьбай паказаць у кніжцы здымак царквы з маёй паштоўкі. І вельмі добра, на тое ж той партал! Адно прашу прысылаць тую кніжку з паметкай майго прозвішча пры здымку.

Пасля 1918 года польскія ўлады перавялі ўсю маёмасць Праваслаўнай царквы і царскай сям'і ва ўласнасць дзяржаўнай казны. І дзяржава, у залежнасці ад акалічнасцей, альбо вяртала маёмасць праваслаўным, засноўваючы прыход, або не аддавала — прыстасоўвала на розныя мэты. Большасць цэркваў была заменена на гарнізонныя касцёлы, іншыя цэрквы зносілі, іншыя прыстасоўвалі на будынкі публічнага карыстання, напрыклад, будынак царквы ў Серпцы (Мазавецкае ваяводства) быў перабудаваны для патрэб суда. У Орлі захавалася сінагога. Але ці хто ведае, што ў Кракаве ёсць праваслаўная царква па вуліцы Шпітальнай 10. Там была сінагога, якая апусцела пасля вайны; у Кракаве раней царквы не было. Ёсць вельмі многа выпадкаў, калі Каталіцкі касцёл пераняў цэрквы, прыстасаваў іх да лацінскага абраду і карыстаецца імі.

Мы вельмі многа ўдзячны нямецкім фатографам. Маем паштоўкі з такіх мясцовасцей, як Орля, Тапілец, Тапчыкалы, Шчыты-Дзенцялова, выкананыя нямецкім салдатам, які там пабываў, жыў у двары і пры нагодзе рабіў здымкі, запісваючы на іх як тады выглядала вёска, як выглядала царква, як дрэвы, як выглядалі людзі. І гэта нам асталося.

Паштоўкі тыя адметныя. На іх маем надпісы па-руску, па-польску, панямецку, значыць паштоўкі былі прымеркаваны для кожнага і кожны мог карыстацца сваёй мовай. Эканоміка вырашала, што на адной паштоўцы суіснавала некалькі моў.

Вельмі часта паштоўкі прымяняліся ў якасці рэкламных лістовак, напрыклад, крамы. Чалавек нешта ў краме купляў, а прадавец уручаў яму паштоўку, каб зайшоў яшчэ раз.

Калі праваслаўным вярнулі будынак колішняга манастыра ў Турковічах, дык епіскап Авель хацеў яго перабудаваць для царкоўных патрэб і выканаць галоўны ўваход. Аднак захавальнік даўніны не згаджаўся, настойваючы, што там раней такога ўваходу не было. Але ў мяне быў даўні здымак манастыра і на яго аснове быў яму вернуты ранейшы выгляд. Царква ў Турковічах была драўляная, яе ўжо няма, згарэла, але група аўстрыйскіх жаўнераў сфатаграфавалася на яе фоне і дзякуючы таму, што яны там хацелі сфатаграфавацца, ведаем, як яна калісь выглядала.

У завяршэнне сустрэчы спадар Аляксандр Сасна яшчэ раз заахвочваў сабраных падпісваць свае хатнія калекцыі здымкаў. А дырэктар школы Дарыюш Гарадзецкі пажадаў збіральніку ўзбуйненне калекцыі рарытэтамі ды заахвочваў публіку глядзець здымкі на стэндах.

Мерапрыемства задаволіла цікавасць публікі, яго тры гадзіны прамінулі маланкава. Аўтар ахвотна расказваў бы далей, але ... трэба было закрыць школьны будынак. І публіку трэба пахваліць за яе цярплівасць, за тое, што столькі часу вытрывала ў мала выгадных дарослым школьных крэселках. Мяркую, што аўтара паказу варта запрасіць у Орлю (і не толькі) яшчэ.

## Белавежскія вуліцы прыгажэюць

Нядаўна інфармаваў я нашых чытачоў аб перабудове вуліцы ген. А. Вашкевіча ў Белавежы. Працы ідуць хуткімі тэмпамі і, магчыма, закончацца датэрмінова. Выконвае іх Дарожна-маставое прадпрыемства „Максбуд" з Бельска-Падляшскага. Але, вось, напрыканцы мая г.г. распачалася таксама перабудова другой важнай вуліцы ў Белавежы — Трапінкі. Сельскагаспадарчы кааператыў з Кляшчэляў, які выйграў таргі на выкананне гэтай івестыцыі, сарваў ужо асфальт з вуліцы і будзе пракладваць бардзюры і класці брусчатку на маставой. На вуліцы памяняецца таксама асвятленне. Самой вуліцы прызначаецца новая функцыя — месца для прагулак па мястэчку для турыстаў. На іншай вуліцы — Спартовай, вядзецца зараз пракладка каналізацыі. Усе гэтыя працы, выконваныя ў той самы час, трохі дэзарганізуюць дарожны рух, асабліва на Трапінцы, але потым будзе ўжо прыемна паглядзець на мястэчка і не саромецца перад турыстамі.

**Пётр БАЙКО**

Беласток

## Зацёртыя палосы

Пасля зімы на шмат якіх вуліцах у Беластоку зусім зніклі з асфальтавых маставых г.зв. зебры. Найбольш зацёртых белых палосаў на тых артэрыях, па якіх ездзіць найбольш аўтамабіляў, а таксама на скрыжаваннях вуліц. На скрыжаваннях дарог аўтамашыны тармозяць і сціраюць фарбу. Ужо на двары стаіць май, але, як дагэтуль, не малююць яшчэ белых палосаў для пешаходаў.

Зараз найбольш амаль невідочных белых палосаў між іншым на доўгай беластоцкай вуліцы 27 Ліпеня, якая вядзе ў Грабаўку, Саўляны, Каракулі і Цеснае. Як вядома, людзі пераходзяць з аднаго на другі бок вуліцы. А белых палосаў — як на лякарства. На іх пешаход адчувае бы сябе куды бяспечней.

Калі белыя палосы зацёртыя, вадзіцелі аўтамашын іх не ўбачаць. Пешаходы доўга чакаюць, каб перасячы вуліцу. Так часта бывае на рухлівай вуліцы 27 Ліпеня. Аўтар гэтага допісу пераканаўся ў тым, ідучы абочынай гэтай вуліцы-дарогі каля колішняй цяпліцы ў канцы горада. Ёсць там канцавы прыпынак аўтобусаў гарадской камунікацыі. Хто ідзе ў Саўляны, павінен перайсці цераз дарогу на другі бок. Белых палосаў тут няма. Нікому ў галаву не прыйшло іх намаляваць. А аўтамашыны тут імчацца як віхор!

## Няма дошкі аб'яў

Хуліганы разбілі — зруйнавалі прыгожую дошку аб'яў на двух слупах у цэнтры Саўлян Супрасльскай гміны. Знаходзілася яна ў вельмі зручным месцы: на скрыжаванні вуліц Святога Крыжа і Святога Марка, ды побач прыпынка аўтобуса лініі 13 беластоцкай гарадской камунікацыі. Саўляны далёка ад паліцэйскіх пастарункаў у Васількаве і Супраслі. Паліцыя зрэдку сюды заглядае, хіба толькі тады калі жыхары выклікаюць па справах разбою ці другіх крымінальных злачынстах.

**(яц)**


Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі









# XXIV сустрэчы ЗОРКІ





8–14 06 2010 Новае Ляўкова
Фотарэпартаж пра людзей пушчы














# Галерэя дэкламатараў „Роднае слова 2010”


Эва Базылюк


Юстына Давідзюк


Кася Бількевіч


Якуб Андрацкі

З ПАДЛЯШСКАГА СВЕТУ

## Сацы

Лета — несумненна час шматлікіх вандровак. Чарговай мясцовасцю, якую прапаную наведаць у рамках нашых падарожжаў, з'яўляюцца Сацы, што ў Нарваўскай гміне. Назва вёскі праўдападобна выводзіцца ад „сацэня” вады. Ідзе тут пра маленькі ручаёк, які праплывае праз вёску. Першы пісьмовы ўспамін пра вёску датуецца 1560 годам, калі Сацы належалі да Трасцянскага войтаўства.

У другой палове XIX стагоддзя ў Сацах паўстала школа, якую ў пачатку 90-х гадоў гэтага ж стагоддзя перайменавалі на царкоўна-парафіяльную школу. Дзякуючы гэтаму шматлікія жыхары вёскі, у адрозненні ад многіх сялян Беласточчыны, умелі чытаць і пісаць.

1915 год у гісторыі Сацоў, як і многіх іншых падляшскіх вёсак, быў вельмі трагічны. Жыхары былі вымушаны ўцякаць ад нямецкіх войскаў у глыб Расіі. З бежанства вярталіся толькі ў 1919 годзе. На месцы чакалі іх спаленыя расейскімі войскамі дамы, зарослыя палі. Гаворыцца, што трагедыя бежанства затрымала на доўгі час развіццё падляшскіх беларускіх мясцовасцей, паколькі іх жыхары мусілі пачынаць усё з нуля.

У вёсцы Сацы па сённяшні дзень захавалася шмат прыкладаў драўлянага будаўніцтва Падляшша. На многіх хатах захавалася драўлянае традыцыйнае аздабленне, характэрнае падляшскаму будаўніцтву. Цікавае таксама самое распалажэнне вёскі. Сацы гэта шэраговая вёска. І не было б у гэтым нічога дзіўнага, паколькі большасць вёсак у нашым рэгіёне пабудаваных у такі спосаб. Аднак Сацы характэрныя тым, што яны падзеленыя на дзве паралельныя часткі, паміж якімі праплывае рэчка Рудня.

Сацы апынуліся на шляху „Краіна адкрытых аканіц”, мэта якога, між іншым, ахова і захаванне традыцыйнага драўлянага будаўніцтва і аздабленняў у гэтай частцы Падляшша.

У Сацах варта таксама паглядзець драўляную каплічку з пачатку XX стагоддзя, якая знаходзіцца ў канцы вёскі.

Міхась СЦЕПАНЮК

## Музыка з кайфам

### „Васількі, валошкі”

Мабыць вучні, якія на ўроках сутыкаюцца з беларускай паэзіяй, ведаюць гэты загаловак. „Васількі, валошкі” — верш Віктара Шведа, які стаў адначасова загалоўкам альбома з песнямі на словы гэтага беластоцкага аўтара. Аб'яднанне бацькоў АБ-БА падрыхтавала альбом да юбілею 85-годдзя Віктара Шведа. З гэтага тыдня можна дыск узяць у рукі, а перш за ўсё паслухаць. Хаця альбом рыхтавалі бацькі, то вялікую частку песень выконваюць наймалодшыя выканаўцы, тым больш, што знакамітую частку сваёй творчасці аўтар прысвяціў дзецям. Побач вучняў пачатковай школы прэзентуюцца на альбоме маладыя рокмены з гурту „Клюквы”, пра які мы тут раней ужо пісалі. Дарослую творчасць Віктара Шведа аранжыравалі таксама дарослыя выканаўцы. Сярод дваццаці пяці стужак знойдзем выкананні калектыву „Каласкі” і „Рэчанька”, які месцамі нагадвае польскія „Філіпінкі”, а таксама яго салісткі, ветэранкі беларускіх фестываляў Любы Гаўрылюк супольна з дачкой Алай Каменскай. У рокавы бок пайшлі таксама ўдзельнікі гурту „ILO&friends”, якія запісалі песню на верш напісаны Віктарам Шведам у 1950-я гады. Зразумела, сваю лепту ўнеслі самі бацькі з аб'яднання АБ-БА, якія штодзень складаюць свой калектыў аўтэнтычнага фальклору. У іх выкананні можам пачуць так разнародныя прапановы як частушкі і калыханка. Паяўляецца час ад часу таксама голас героя гэтага альбома. Віктар Швед чытае між песнямі выбраныя вершы.




Варта таксама ў пару словах сказаць пра выгляд альбома. Вокладка інспіраваная любімай Шведавай кветкай — васільком. У фоне нібыта ноч у вёсцы, хаця можа быць гэта любая пара дня. Найважнейшае, што адсылае нас у скарбніцу ведаў пра нашае жыццё — да бацькоўскіх і дзедавых хат. Пачынаюцца канікулы, таму можаце пачаць гэтыя чароўныя пошукі, а ў высокім збожжы пашукаць сапраўдных васількоў.

i_basovka@o2.pl

## Польска-беларуская крыжаванка № 25

**Запоўніце клеткі беларускімі славамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў, дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.**

**Адказ на крыжаванку н-р 21:**

**Ліпа, кок, шматкі, чар, ар, зайчык, ох!, схоў, аса. Ліпа, кок, шматкі, чар, ар, зайчык, хох, схоў, аса. Лета, зух, пушча, май, харч, какос, клір, ха!.**

**Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі: Паўліна Паплаўская** з Бельска-Падляшскага і **Наталля Тарасюк** з Дубін. Віншуем!



Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

# Была Сакольская пушча

**Паўвека таму візітнай картачкай Гайнаўкі здавалася мне быць тамашняя „Хімічная”. Мо таму, што мой поезд у гэты горад праязджаў акурат побач яе, а мо таму, што яна найбольш унушальна ўздзейнічала на мой тады вясковы нюх, выкідаючы ў атмасферу густыя клубы жоўта-белага дыму ды ўзбагачаючы рубрыкамі табліцы Мендзялеева рачулку Лясную, якую жыхары горада пяшчотна называлі Смярдзёлкай.**



Не сакрэт, што гайнаўская прамысловасць, у тым ліку і хімічная, карысталася сыравінай, якую давала Белавежская пушча. Ужо ў часах Жыгімонта Аўгуста, які панаваў у Рэчы Паспалітай у сярэдзіне XVI стагоддзя, у пушчы з'явіліся першыя вестуны пазнейшай хімічнай прамысловасці, паўсталі смалакурні ды пачалася вытворчасць паташу, драўніннага вугалю, дзёгацю... Георгій Валкавыцкі ў „Белай вязі” (с. 43) пісаў пра гэта так: „Было ясна — старая паташня, трывалы след рупнай дзейнасці Пятра Фальчэўскага. Клапоцячыся аб эканамічным развіцці краіны, гэты дзяржаўнік уводзіў „прагрэс” дзе толькі мог. Амаль адначасова з Валовічавым парадкаваннем, знявечыў Пушчу руднямі, паташнямі, смалакурнямі. Урочышча Шчэкатова было адным з участкаў, на якім ішло знішчальнае змаганне з Пушчай. Сцягнутыя з Маравіі, Мазовіі і Жэмайціі майстры сяліліся паблізу працы ў наспех збітых будах. Адсюль суседнія Буды і буднікі. Цераміскі і Пагарэльцы ў нас таксама называюць Будамі”.

Дзяржаўнай казне патрэбныя былі грошы, таму каралі аддавалі ўчасткі пушчы ў арэнду розным прадпрымальнікам, якія вось так нявечылі яе. Праўда, Белавежскую пушчу ўдалося ў пару ўратаваць ад знішчэння, а вось колішняя Навадворская была абскубана з усіх бакоў і сёння па ёй астаўся толькі ўспамін; амаль тое ж самае сталася і з Сакольскай пушчай...

Ота Гедэман, бадай найбольш аўтарытэтны даследчык гісторыі Белавежскай пушчы, згадваў: „Niesłychanie ciekawym świadectwem, acz z innego terenu, jak bezpośrednio ucierpiały puszcze królewskie podczas Wojny Północnej, są następujące fakty: w r. 1710 zarząd ekonomii grodzieńskiej przyaresztował w puszczach Perstuńskiej, Przełomskiej, Sokólskiej i Nowodworskiej popioły i potaże wyrobione przez kupca-hurtownika Sardiego, zarzucając mu iż wbrew kontraktowi palił nie w 12, lecz w z górą 40 miejscach, przez co puszcze zostały wniwecz obrócone i funditus w ostępach wycięte. Pełnomocnik Sardiego zaprzeczył temu i wyjaśnił, że do zniszczenia puszcz przyczynił się sam zarząd, bo wszystkie zawaliny Puszczy przez wywroty od wiatra są poczynione i od samego podłowczego wycięte, kiedy zasieki z rozkazu JKMości przed Szwedami czynił, wycinając w ten czas więcej niżeli na 30 mil (150 wiorst!!) Puszczy. Wiarogodność tego oświadczenia sprawdziliśmy korzystając z innego źródła: inwentarz leśnictwa Nowodworskiego z 1712 r. stwierdza upadek pszczelnictwa i „popsowanie” większej części barci, spowodowane przez różnych wstępników, a ostatnio przez zasieczenie Puszczy przez Szweda”.

І сапраўды, ад колішняй Навадворскай пушчы, якая ў агульнасці займала паўночную частку сённяшняга Сакольскага павета, між рэчкамі Бобрай, Бярвіхай і Альшанкай, на сённяшні дзень амаль нічога не асталося. Крыху лепш пашанцавала Сакольскай пушчы, якая займала прастору ад ракі Свіслачы на ўсходзе да граніцы Вялікага Княства Літоўскага з Каронай на захадзе, а яе паўднёвай мяжой была рэчка Супрасль. Яна ў XVI стагоддзі была раздзелена на чатыры меншыя пушчы-кватэры, якія пралеглі доўгімі палосамі з усходу на захад: Кузніцкую, Малявіцкую, Адэльскую і Крынскую; з іх да нашага часу найлепш захавалася апошняя, якая стала ядром пазней названай Букштэльскай пушчы, пасля апошняга ўстанаўлення дзяржаўных граніц далучанай да Кнышынскай.

Межы Кузніцкай пушчы сягалі на захадзе да Скіндзера і Чорнага Стоку. Ардынацыя каралеўскіх пушч, складзеная ў 1641 годзе, так яе характарызуе: „Ta puscza poczyna się na wschód słońca od Kamienney doliny aż po Popław ku południowi, a na zachód słońca do sadów, z tamtąd po rzekę Brzozową i po gościniec Knyszyński, bokiem od leśnictwa Nowodworskiego, na Horodzieiow wygon, na Dubrowkę (так калісь называўся Карыцін) przy ostempie Jelińce, brzegiem do Koparnowego gościńca przeciwko Sidrze, który idzie do Nowego dworu. W którey kwaterze, iż wiele rożney szlachty puscze nie miało za włoki puste poupraszali y za przywileiami i.k. mści trzymaią, rozrobki czyniąc, coraz daley w pusczą wdzieraią...”

Усходніх нетраў гэтай пушчы — м.інш. Прыстаўкі, Сітаўкі, Васілёўкі — павінны былі пільнаваць асочнікі з Краснага Дуба (так калісь называлася сённяшняя Новая Воля, што ў Янаўскай гміне). Былі лясныя нетры і на захадзе пушчы: „Ostempy teyże kwatery od granicy Podlaskiey: Krasny lod, Ozierodek, Pryhorok, Korpieiki, Olchowy, Niemczyna, Kunie, Niedźwiedzia głowa, Oleszkowo. (Складана здагадацца, як сёння называюцца пералічаныя мясцовасці, але здаецца, што мова тут пра сучасныя м.інш. Алешкава, Немчын, Язерыск, Краснае...) W tych ostempach wszystkich (...) przeszłych lat i tego roku (...) robione towary leśne, iako, wanczos (калоды), klepkę, bale i popioł palony”.

Вось, следам гэтага попелу, мабыць, з'яўляецца вёска Папялоўка, што па шашы з Беластока ў Карыцін. Адкуль яе назва, дзеля чаго быў калісь патрэбны попел? Попел быў сыравінай для вырабу паташу. Для гэтай мэты найбольш прыдатныя былі сасна, клён і бяроза, дзе найбольш карбанату калію. Па-арабску попел называўся аль-калі, і з гэтага ўзялася назва хімічнага элемента калію. А назва паташ пайшла са словазлучэння англійскіх слоў *pot* (парашок) і *ash* (попел). З зямлі калійныя солі сталі капаць у XIV стагоддзі ў Эфіопіі, у наш час адным з найбольш вядомых іх радовішчаў з'яўляецца Салігорск у Беларусі. Паташ быў патрэбны для выбельвання тканін, для вытворчасці фертылізатараў, мыла, шкла. З аднаго кубічнага метра драўніны атрымлівалі калісь толькі паўкілаграма паташу; многа лесу трэба было спаліць. Ды каштоўны паташ з нашых лясоў быў патрэбны галоўным чынам багатаму еўрапейскаму захаду. Ды не толькі паташ, таксама стройныя ствалы на карабельныя мачты ці смала для тых жа карабельных карпусоў. Наш паташ і іншыя драўнінныя вырабы Нёманам і Віслай траплялі ў багатую ганзейскую зону...

Не менш цікавыя і іншыя назвы тамашніх вёсак. Напрыклад, Ломы і Паломін; ці гэтыя назвы не сведчаць пра той лесапавал, які быў, мабыць, своеасаблівым мінным полем згаданаму шведскаму войску?.. Францкава Буда і Будна выводзяцца з таго ж кораня што і падбелавежскія вёскі. А вось Вылуды ці Вылудкі красамоўна сведчаць, што *wiele rożney szlachty puscze nie miało za włoki puste poupraszali y za przywileiami i.k. mści trzymaią.* Значыць — *wyłudzili* ў сваіх вяльможных...

Апісальнікі мясцовай гісторыі даволі агульна пішуць пра вытокі засялення гэтага кутка Сакольшчыны. У сярэдневяковую эпоху мелі тут пражываць яцвяжскія плямёны, аднак з прычыны суседства экспансіўных і вельмі ваяўнічых крыжацкіх, літоўскіх, мазавецкіх ды ўсходнеславянскіх ваякаў, якія праходзілі праз гэтыя землі з грабежчымі мэтамі, жыць тут стала невыносна. І таму гэтыя землі ў позняе Сярэдневякоўе апусцелі. Толькі пасля — як ні парадаксальна гаварыць — міратворнай Грунвальдскай бітвы і змірэння яе пераможцаў зноў стала магчымым спакойнае жыццё на гэтай тэрыторыі. Зноў сталі сюды пранікаць людзі, а звонку з'явіліся стымулы для выкарыстання лясной сыравіны. Гэта ж у той час адбыліся вялікія геаграфічныя адкрыцці, узніклі новыя, марскія, магчымасці заходнееўрапейскай экспансіі, спатрэбілася караблебудаўнічая драўніна ды вырабы з яе. І калі захад Еўропы кінуўся ў заакіянскія ваяжы, цэнтр і ўсход кантынента кінуўся на свае лясы, пры нагодзе расчышчаючы сабе прастору для новых пасяленняў, якім не пагражалі магутныя грабяжы.

Мясцовыя польскамоўныя гісторыкі заяўляюць, што тэрыторыю Навадворскай і Сакольскай пушчаў засялялі мазаўшане. Іаанна Сакульска так піша пра Сакольскую пушчу: „Prowadzona była [kolonizacja] z dwóch stron: od Sidry i od Brzozowej. Doprowadziło to do prawie całkowitej likwidacji puszczy między tymi rzekami. Już w XVIII w. pozostał jedynie wąski pas leśny oddzielający osadnictwo mazowieckie z zachodu od ruskiego ze wschodu”. Яно так можа падавацца, калі паслухаць афіцыйную — панскую — гаворку тамашніх сялян. Але калі прыслухацца менш афіцыйна, спадцішка, як гэта мне ўдалося ў Лубянцы, то вылазіць наверх пабытавая мужыцкая мова тамашняга насельніцтва. Ці яна таксама прынесена з Мазовіі? Каб адказаць на гэтае пытанне, трэба прыгадаць простую ісціну пра аўтараў гісторыі. Самі гісторыкі заяўляюць, што гісторыю пішуць пераможцы. Але пішуць яе таксама тыя, хто ўмее пісаць. А ў нашым выпадку ўмелі пісаць асобы духоўныя, якія — а прынамсі іх размашыстая духоўнасць — наплывалі менавіта з мазавецкага напрамку. Затое ж мужыцкія патомкі лесарубаў пісаць не ўмелі, яны маглі толькі цішком захаваць сваю мову — прынамсі да эпохі масавага тэлебачання. Таму пісанае слова — лацінкай...

Вёскі на поўдзень ад Карыціна і Янава выглядаюць так як і ўсюды. Відаць тут новы гаспадарчы парадак, дзе адны гаспадаркі трымаюцца на плаву, а іншыя здалі пазіцыі. Гаспадары стараюцца абрабляць зямлю, не відаць тут вялікіх пасадак, адно сасновыя лапікі на вярхах узгоркаў і альховыя ў нізах. У Вострай Гары працуе крама, але на мой час была там толькі прадаўшчыца, якая патлумачыла, што акурат выпаў майстарскі дзень і людзі нечым занятыя, шмат хто паехаў на базар у Сухаволю. А ў іншыя дні ў краме людна і весела, часам аж надта.

Перад Лубянкай падганяе мяне дождж, ад якога хаваюся пад страхой прылеглай да вуліцы стадолы. Тут таксама ёсць крама, якой гаспадар, мабыць, гандлюе ў вядомыя вяскоўцам гадзіны. Маю ўвагу прыцягваюць бетонныя слупы вулічнай агароджы з уфармаванай



на іх датай: 1941 год; амаль семдзесят гадоў стаяць ужо яны...

Лубянка з'яўляецца парафіяльнай вёскай — тут касцёл пабудаваны ў 1958 годзе і разбудаваны ў 1981-82 гадах. Да званіцы касцёла прытуленае Распяцце з велізарнай — мо чатырохметровай вышыні — фігурай Збавіцеля. Сама вёска здаецца быць вельмі маладой — у апісаннях Карыцінскай і Янаўскай парафій ад 1784 года яна не згадваецца, а суседнія Астрынка, Здроі ці Сіткова называюцца новакультурнымі, значыць толькі што заснаванымі.

Назва гэтай парафіяльнай вёскі выводзіцца ад лубу. Слова луб здаецца быць ужываным на ўсходзе Славяншчыны, бо на захадзе гаворыцца выключна пра лыка. Цалкам магчыма, што засяленцы гэтай вёскі не займаліся ўжо высечкай лесу для пе-

працяг ☞ 9

*Святкаванне 20-годдзя дзейнасці бельскага самаўрада адбылося ў час XXXI Дзён Бельска-Падляшскага, разам з адзначэннем 515-годдзя прысваення гораду магдэбургскіх правоў*

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

# Поспехі і паразы ў самаўрадавай дзейнасці

**— Намеры самаўрадавай рэформы былі вельмі добрыя, бо ў гмінных самаўрадах мелі рэалізавацца патрабаванні грамадства, якое мела масава ўключыцца ў грамадскую дзейнасць. Зараз у самаўрадах, асабліва ў гарадскіх, штораз большае ўздзеянне маюць палітычныя партыі, так як на нашым панадворку СЛД ці ПіС. Хаця партыі можа і маюць большую магчымасць прыцягваць вонкавы капітал, то не маюць становішча ўздзеяння на актыўнасць звычайных, знеахвочаных да грамадскай дзейнасці людзей, — заявіў старшыня Рады горада Бельск-Падляшскі Андрэй Сцепанюк, які раней 8 гадоў быў бельскім бурмістрам.**

27 мая 1990 года адбыліся першыя самаўрадавыя выбары ў ІІІ Рэчы Паспалітай Польскай і ад гэтага часу мінула якраз 20 гадоў, што стала зручнай нагодай для падвядзення вынікаў тэрытарыяльнай самаўрадавай рэформы. З гэтай нагоды ладзяцца мерапрыемствы. Напярэдадні самаўрадавых выбараў, што маюць адбыцца восенню гэтага года, бурмістры і войты (старасты ў мінулым годзе святкавалі 10-годдзе аднаўлення паветаў) маюць магчымасць становіча паказацца перад мясцовым грамадствам, бо часта з вялікімі грашыма з еўрасаюзнага бюджэту апошнім часам былі рэалізаваны вялікія інвестыцыі.

Пачаткі самаўрадавай дзейнасці былі цяжкімі з-за недахопу сродкаў, нават для самых важных гмінных інвестыцый. Людзі па вёсках і гарадах сталі крытыкаваць палітычную і гаспадарчую трансфармацыю ў краіне якраз у вялікай ступені з-за інвестыцыйнага заняпаду. 18 ці 19 гадоў назад гаварылася: „Што камуна збудавала, тое і ёсць, а зараз на ўсё грошай не хапае”. Тады прыходзілася ездзіць па дзіравых гмінных дарогах, бо не было грошай, каб акуратна заасфальтаваць іх. Спачатку ў вясковых гмінах спыняліся большыя інвестыцыі, каб сродкі, якімі дабавалася дзейнасць самаўрадаў, можна было выдаткаваць на бягучыя расходы. У нашых вёсках не было відаць таксама вялікай ангажаванасці мясцовага грамадства ў самаўрадавую дзейнасць, бо сяляне ў першым этапе трансфармацыі вельмі адмоўна адчулі яе паслядоўнасці і, умомант абяднеўшы, пачыналі крытыкаваць усялякія перамены. Больш становіча да самаўрадаў ставіліся маладыя вяскоўцы, якія бачылі патрэбу ўводзіць змены ў гмінах і разумелі, што маючы свайго прадстаўніка ў радзе маюць магчымасць выносіць прапановы ад імя сваёй вёскі на гмінных сесіях і патрабаваць іх рэалізацыі. Спачатку войтамі ў нашых гмінах часта заставаліся гмінныя начальнікі, якія кіравалі пры народнай уладзе і на практыцы яны канчаткова вырашалі аб больш гмінных інвестыцыях. Зусім інакш справа мелася ў гарадах. У Бельску-Падляшскім і Гайнаўцы праявілася вялікая ангажаванасць беларускага грамадства ў час першых вольных самаўрадавых выбараў, хаця хутка ў гарадскіх радах паявіўся падзел па лініі каталікі — праваслаўныя, што крыху спыніла самаўрадавы энтузіязм нашых людзей. У Бельску-Падляшскім пасля першых самаўрадавых выбараў правячую кааліцыю ў радзе і магістраце стварылі ў галоўным прыхільнікі „Салідарнасці” і ў першым скліканні бурмістрам быў Казімеж Ляшчынскі. У 1994 годзе бурмістрам Бельска-Падляшскага стаў Андрэй Сцепанюк, а да правячай кааліцыі належалі радныя Бельскай кааліцыі, якую састаўлялі прадстаўнікі Беларускага і Украінскага камітэтаў і асобы ад СЛД, а ў супрацоўніцтва з гэтай кааліцыяй уступілі радныя Самаўрадавай правіцы „Адзінства”.





*Радныя Беларускага камітэта Дарафей Фіёнік і Андрэй Сцепанюк (старшыня рады і былы бурмістр) лічаць, што было намнога больш плюсаў, чым мінусаў у дзейнасці бельскага самаўрада*

— Радных Бельскай кааліцыі хапала, каб з 1994 года самастойна правіць у радзе, але ў нас не хапала аднаго раднага, каб выбраць бурмістра. Мы пагадзіліся, каб у гарадскую ўправу з сямі чалавек ўвайшлі тры асобы ад правіцы і іх прадстаўнік стаў віцэ-бурмістрам. Аднак пасля некалькіх гадоў гэтая кааліцыя разляцелася, а да канца склікання і ў 1998-2002 гадах кіравала ўжо толькі Бельская кааліцыя, — сказаў старшыня Рады горада Бельск-Падляшскі Андрэй Сцепанюк, які ў 1994-2002 гадах быў бурмістрам горада ад Беларускага камітэта. З 2002 года па сённяшні час Бельскам кіруе бурмістр Яўген Беразавец ад СЛД, які карыстаўся падтрымкай радных клуба СЛД і ў розным часе радных іншых клубаў. Паколькі не змог ён стварыць у бельскай радзе стабільнай кааліцыі, якая пастаянна падтрымлівала б яго, бывалі праблемы, каб рэалізаваць некаторыя яго ныя прапановы.

— У выпадку Бельска нашай паразай з'яўляецца тое, што мы не патрапілі прыцягнуць маладых да самаўрадавай дзейнасці і надалей галоўнае значэнне ў горадзе маюць асобы, якія займалі кіраўнічыя пасады пры камуне, — лічыць старшыня бельскай рады Андрэй Сцепанюк.

Нястача сродкаў на падставовую гмінную дзейнасць была кароткай, а пасля ў гмінных бюджэтах пачалі паяўляцца штораз то большыя сродкі на інвестыцыі. Разам з большымі грашыма ішлі таксама большыя кампетэнцыі гмінных самаўрадаў і большая іх незалежнасць ад урадавых структур. У Бельску-Падляшскім самымі вялікімі гарадскімі інвестыцыямі былі разбудова і мадэрнізацыя цеплаэлектрастанцыі, будова крытага басейна і перабудова гарадской звалкі смецця. Апошнім часам з выкарыстаннем значных еўрасаюзных сродкаў мадэрнізавалася ў Бельску многа дарог. Каналізацыйныя і дарожныя інвестыцыі праводзіліся ў горадзе таксама і раней, але ў меншым маштабе.

— Глянуўшы на дзейнасць самаўрадаў праз прызму інвестыцый відаць, што апраўдалася перадача шырокіх кампетэнцый і задач на ўзровень гмін. Зараз бюджэты нашых гмін абапіраюцца на канкрэтныя падаткі, якія непасрэдна іх папаўняюць. Аднак шкада, што за штораз то новымі задачамі не пайшлі дастатковыя сродкі на іх выкананне, — сказаў старшыня бельскай рады Андрэй Сцепанюк.

Калі глянуць на інвестыцыі і астатнюю актыўнасць у нашых гмінах, несумненна становічых праяваў самаўрадавай дзейнасці заўважаецца намнога больш, чым адмоўных, і гэта тычыцца таксама Бельска. Аднак, беручы пад увагу недахопы, можна іх у будучыні пазбегнуць.

— Адной з самых вялікіх паразаў у самаўрадавай дзейнасці ў Бельску з'яўляецца недагляд у справе комплексных археалагічных раскопак у цэнтры горада, што павінны праводзіцца перад будовай каналізацыйных сетак, водаправодаў, мадэрнізацыяй і асфальтаваннем дарог. Вяліся там толькі археалагічныя нагляды, што было абавязковым у такіх выпадках. Археалагічныя раскопкі спынялі б інвестыцыі на нейкі час, але давалі б вялікія магчымасці даследаваць далейшае мінулае Бельска. Выключэннем была мадэрнізацыя вуліцы Замкавай, на якой археалагічныя раскопкі праводзіліся ў 1997 годзе, калі бурмістрам быў Андрэй Сцепанюк, — заявіў радны Дарафей Фіёнік, старшыня Аб'яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах”, якое збірае матэрыялы да гісторыі Бельска. — Іншая справа, з якой у Бельску не справіўся самаўрад да гэтай пары, гэта рэкламны хаос у цэнтры горада. Не можа быць так, каб стары будынак, помнік архітэктуры, прыкрывала велізарная рэклама, або каб каля сакральнага будаўніцтва красавалася рэклама з ледзь не аголенымі жанчынамі. Толькі цяпер у магістраце рыхтуецца праект пастановы, які мае зрабіць парадак з рэкламай у нашым горадзе. Паразай было таксама далейшае разбуранне даўняга драўлянага будаўніцтва ў цэнтры Бельска, якое найбольш было знішчана ў васьмідзесятых гадах, у час будавання блокаў.

Калі праводзілася самаўрадавая рэформа прадбачвалася, што галоўная ўлада трапляе ў рукі радных — заканадаўчай улады. Але з увядзеннем непасрэдных выбараў бурмістраў і войтаў заўважальна ўзраслі кампетэнцыі выканаўчай улады. Адчулі гэта ў Бельску-Падляшскім гадоў тры таму радныя, якія прагаласавалі ўвядзенне змен у праект бюджэту горада на этапе яго прымання, уводзячы да рэалізацыі некалькі новых інвестыцый і паказваючы адкуль узяць сродкі ў бюджэце на іх прафінансаванне. Аднак з гэтымі зменамі не пагадзіўся бурмістр Яўген Беразавец і справа трапіла ў Вярхоўны адміністрацыйны суд.

— Мы справу змен у бюджэце ў Вярхоўным адміністрацыйным судзе выйгралі і бурмістр Яўген Беразавец мусіў рэалізаваць нашы прапановы. Паказалі мы, што радныя могуць выйграць у канфрантацыі з выканаўчай уладай, калі за намі стаіць закон, а сярод нас ёсць знатакі эканоміі. Канешне, так ое не могуць пайсці радныя вясковых гмін, якія часта не ведаюць сваіх правоў і як за іх змагацца, — заявіў бельскі радны Дарафей Фіёнік.

*(заканчэнне будзе)*

8 ☞ працяг раўтварання драўніны ў іншыя рэчывы, толькі скарыстоўвалі лясныя матэрыялы для вырабу пабытавых прадметаў. З ліпавага і лазовага лыка плялі калісь лапці і трэба было добра старацца, бо такія лапці трымаліся ўсяго два-тры тыдні. А лубянкі з ліпавага лыка выраблялі яшчэ да пачатку ХХ стагоддзя...

У Лубянцы прыцягнуў маю ўвагу стары каменны крыж; спытаў я пра яго мужчын, што выйшлі побач на вуліцу. Аднак яны не ведалі, калі ён там з'явіўся. Адзін з іх паказаў мне іншы крыж-валун, інфармуючы, што ён там стаіць увесь час, які ахоплівае яго ная памяць. Пастаўлены ж тыя крыжы Усявышняму і толькі Яму вядомыя іх сакрэты...

Прайшоўся я яшчэ ў Астрынку, каля Сарочага Мастка, праз Тэолін зайшоў у Сітаўку — калісь там меў быць млын... Вось апісанне тых дарог з 1784 года: „Droga do karczmy i młyna Sitawki, przez mostek i małą rzeczkę, którą zowią Pryską [dziś Kumiałka], bierze swój początek około wsi Teolina z krynic w polach, idzie około wsi Przystawki i wsi Sitawki, wpada nareszcie do stawu Janowskiego. Od karczmy Sitawki idzie droga na południe do wsi tegoż nazwiska Sitawki razem i do wsi Teolina, gdzie koniec parafii janowskiej. (...) Druga droga z Teolina idzie kręto na wschód zimowy do wsi Ostryńki pod samą puszczą, nowokultarnej (...) Taż droga służy i do strzelców przy puszczy osadzonych. Od karczmy wspomnianej Sitawskiej droga idzie kręto w lewą stronę na wschód zimowy przez pagórek i brodek w krzakach do wioski nowokultarnej nazwanej Rudawka, która leży pod samą puszczą. (...) Lasu parafia janowska nie ma prócz zaroślów”. І тут пра Кузніцкую пушчу можна яшчэ было б дадаць сакраментальнае слова „Amen”.

Дарэчы, лёс Кузніцкай пушчы надта падобны на лёс пушчы Бельскай, якая праз колішні порт у Нарве таксама, здаецца, адплыла ў ганзейскую зону. Ганзейскія гарады аказаліся больш паспяховымі за Гайнаўку каланізатарамі; нават адносна нашых *zaroślów.*

# Літаратурныя падарожжы

(польскамоўныя пісьменнікі на Берасцейшчыне)

## IX



На Берасцейшчыне ёсць шмат месцаў, звязаных з імем Адама Міцкевіча. Гэта, найперш, Завоссе — малая радзіма паэта. Некалі тут, у Завоссі, адзін з фальваркаў належаў роднаму дзядзьку па бацькоўскай лініі — Базылю Міцкевічу. Пасля яго смерці бацька Адама, стаўшы апекуном братавага сына, кіраваў фальваркам. Па словах Аляксандра (сына Базыля), Міцкевічы ў снежні 1798 года пераехалі ў Завоссе, дзе 24 чысла нарадзіўся Адам.

Паколькі асноўным заробкам Мікалая Міцкевіча была адвакацкая дзейнасць, то ён у 1806 годзе перадаў кіраванне фальваркам мужу сваёй сястры — Вінцэсю Стыпулкоўскаму.

Тут, у Завоссі, на працягу 10 год Адам Міцкевіч праводзіў усе канікулы. Прыязджаў сюды будучы студэнтам Віленскага ўніверсітэта.

У першую сусветную вайну (1915 г.) сядзіба была знішчана.

Да 200-годдзя паэта будыніну аднавілі, і сёння яна з радасцю сустракае гасцей і прыхільнікаў таленту генія літаратуры.

Другім па значнасці ў жыцці Міцкевіча месцам на Баранавіччыне з'яўляюцца Туганавічы — маёнтак Верашчакаў.

Сюды ўпершыню ў 1819 годзе прывёз Міцкевіча Тамаш Зан. Былі летнія канікулы. Тамаш Зан сябраваў з сынамі гаспадыні маёнтка — Міхалам і Юзафам. І была ў іх сястра Марыля... Марыля Верашчака... Яна з першай сустрэчы ўразіла паэта начытанасцю, жвавасцю і мяккасцю характару. Менавіта духоўная прыгажосць дзяўчыны вабіла маладога чалавека.

Гэта было каханне на ўсё жыццё, хоць Міцкевіч пры першым спатканні ведаў: Марыля была нарачонай графа Ваўжынца Путкамера, багатага шляхціца.

На той час Туганавічы выглядалі так, як іх апісаў у сваіх нататках Ігнат Дамейка: „Туганавіцкі двор, які ляжаў сярод маляўнічых ваколіц, быў шырока забудаваны. Над ім узвышаліся мураваныя касцёл і афіцына. Вялізны ліпавы парк, мноства гаспадарчых будоў надавалі двару выгляд сядзібы заможнай шляхты".

У адным са сваіх лістоў, знаходзячыся ў эміграцыі, Адам Міцкевіч пісаў Дамейку: „Часта нападае смутак па Літве, і ўвесь час бачу ў сне Наваградак і Туганавічы".

У лютым 1821 года Марыля стала жонкай графа, былога афіцэра напалеонаўскай арміі Ваўжынца Путкамера. Летам гэтага ж года Міцкевіч ізноў наведаў Туганавічы, але ўсё тут ужо было чужым, не такім, як ён апісаў у паэме „Пан Тадэвуш":

*Каліс<u>ь між тых палёў</u> пры рэчцы, на пагорку*
*Сярод бярэзніку, за плотам панадворка,*
*Стаяў драўляны панскі дом і з зеляніны*
*Свяціўся, як сувой кужэльнае тканіны,*
*Тынкоўкай белай сцен над дыванамі поля.*
*Ад непагод затулены сцяной таполяў,*
*Ён невялікі быў, але не занядбаны.*

(У паэме сядзіба Верашчакаў апісана як Сапліцова).

У гады першай сусветнай вайны ўсе будынкі згарэлі. Да нашага часу захаваўся парк, у якім устаноўлены ўказальнікі і мемарыяльныя дошкі ля альтанкі, дзе любілі бавіць час Міцкевіч і Марыля, і ля Каменя філарэтаў (ля вёскі Карчова ва ўрочышчы Кут).

Усё гэта мне памятаецца яшчэ з гадоў далёкага студэнцтва, калі па гэтых мясцінах нас вазіў неўтаймаваны Уладзімір Калеснік.

„Між тых палёў..." — такую назву ён даў фотаальбому з відамі месц, звязаных з імем Адама Міцкевіча. Тэкст да фотаздымкаў напісаў Янка Брыль...

Яшчэ колькі месцаў з Міцкевічам звязаных. Часта разам з бацькамі будучы паэт наведваў вёску Белая, дзе жыла цётка Барбара Стыпулкоўская. Вучоныя сцвярджаюць, што менавіта тут адбыўся выпадак, апісаны ў вершы „Люблю Я"

Бываў паэт у вёсцы Вольна, калі гасцяваў у сябра філарэта Ота Слізеня. З Тамашам Занам наведваў Задзвею і Ішкальдзь, дзе ксяндзом служыў сваяк Міцкевічаў Ян Гарбацэвіч. Прыязджаў у Новую Мыш, дзе на той час жыла сям'я Тамаша Зана. Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што паэт у 1804 годзе вучыўся ў парафіяльнай школе вёскі Сталавічы, што ў васьмі кіламетрах ад Завосся. (Усе названыя населеныя пункты сёння знаходзяцца на тэрыторыі Баранавіцкага раёна).

Застаецца дадаць, што вынікам рамантычнага кахання паэта сталі цудоўныя творы: „Свіцязянка", „Рыбка", „Курганок Марылі", „Дзяды" і інш.

*Дзяцінства край!*
*У ім, небагатым, цесным, я быў шчаслівы;*
*Як Богу — Божы свет, так мой уласны*
*Дом на радзіме быў шырокім светам*
*Усіх маіх вытокаў.*

„Пан Тадэвуш"

**Тамара ЛАЎРАНЧУК, г. Высокае**



# МОВАЗНАЎСТВА

Нягледзячы на заняпад беларускай мовы, яна яшчэ прыцягвае ўвагу і цікавасць навукоўцаў. Больш таго, некаторыя з іх лічаць патрэбным спрыяць распаўсюджванню ведаў аб ёй не толькі ў навуковым коле, але і сярод тых, хто папросту зацікавіцца яе асаблівасцямі. Пэўна менавіта з такіх меркаванняў у сеціве з'явіўся сайт „Мовазнаўства", аўтарамі якога з'яўляюцца два вучоныя-спецыялісты ў гэтай галіне.

Каб бліжэй пазнаёміцца з даным сайтам, трэба набраць на сваім камп'ютары адрас у інтэрнэце **http://mowaznaustwa.ru.** Выгляд галоўнай старонкі даволі ардынарны, але ў той жа час прывабны. Уверсе размешчана назва сайта з выявай гравюры з абліччам усходнеславянскага першадрукара Францыска Скарыны.

Галоўнай мэтай стварэння сайта, згодна паведамленню яго стваральнікаў, было імкненне да распаўсюджвання мовазнаўчых ведаў у беларускім моўным асяроддзі. „Аснову сайта складае лінгвістычная бібліятэка — артыкулы, падручнікі, манаграфіі і слоўнікі, — пішуць яны на старонцы „Пра сайт". — Трэба заўважыць, што на нашым сайце размяшчаюцца толькі навуковыя працы, апублікаваныя раней у «папяровым выглядзе». Адміністрацыя сайта будзе вельмі ўдзячная ўсім, хто палічыць магчымым дасылаць нам для размяшчэння на нашым сайце свае мовазнаўчыя працы. Тэксты публікуюцца на сайце ў арфаграфіі папяровага варыянта".

На той жа старонцы змяшчаецца інфармацыя пра аўтараў партала — гэта філолаг Аляксей Мусоры з расійскага горада Новасібірска і тэолаг Юры Стасюк, які адначасова з'яўляецца каталіцкім святаром.

Усе выйсці да рубрык сайта месцяцца ўверсе выяўлення і з правага боку, што вельмі нетрадыцыйна. Праўда, зместы старонак часцяком дублююць адзін аднаго. Так, галоўная старонка змяшчае практычна ўсе тыя артыкулы, якія знаходзяцца ў рубрыцы „Беларуская мова".

Старонка „Навіны", выйсце да якой стаіць чамусьці далёка не нaперадзе сярод іншых, месціць усяго толькі два мовазнаўчыя артыкулы, напісаныя зусім не ў апошнія гады. Па ўсім відаць, што стравальнікі сайта пакуль не да канца прадумалі дэталі яго насычэння.

Самай першай рубрыкай пазначана „Агульнае і параўнальнае мовазнаўства". Варта адзначыць, што тут месцяцца вельмі цікавыя артыкулы, назвы якіх адразу прыцягваюць увагу зацікаўленага ў мовазнаўстве чалавека — „Беларускі моўны этыкет на фоне рускага і польскага" альбо „Што могуць ідыш, сучасны іўрыт, эсперанта, а таксама сербалужычане, палешукі і хазары сказаць пра паходжанне габрэяў-ашкеназі".

Добра напоўненай інфармацыяй можна лічыць і рубрыку „Еўрапейскія мовы", дзе знаходзяцца артыкулы пра моўныя асаблівасці палешукоў, балцкія гаворкі, мову эсперанта, беларусізмы ў мове рускіх жыхароў Сібіры.

На партале знаходзіцца таксама старонка, прысвечаная ўсходнім мовам. Праўда, пакуль там толькі адзін артыкул — „Мовы Кітая". Такая ўвага да моў менавіта гэтай краіны, пэўна, ад усё больш узрастаючага ўплыву Кітая ў свеце.

Сярод сэрвісаў партала трэба адзначыць наяўнасць пошуку і цэтлікі (тэгі), якія месцяцца з правага боку выяўлення.

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**



**Сумнаваты пачатак**

Пачатак чэмпіянату свету па футболе не прынёс феерычных уражанняў і надзвычайных эмоцый. Так каманды групы „А" прадэманстравалі „працоўны" футбол і не парадавалі яркім відовішчам. У матчы адкрыцця сустрэліся гаспадары турніру — каманда ПАР і дружына Мексікі. Што датычыць гульні, то землякі Мандэлы першымі дасягнулі поспеху. Адыграліся лацінаамерыканцы ў выніку правалу абарончага барыцьёна гаспадароў — дасведчаны абаронец Рафаэль Маркес даслаў мяч па прызначэнні. 1:1 — справядлівы выхад паядынку.

Сустрэча паміж Уругваем і Францыяй характарызавалася большымі хуткасцямі, але ў выніку завяршылася нулявой нічыёй. **Група „А": ПАР, Мексіка, Уругвай, Францыя — па 1 ачку.**

Праграму групы „В" адкрыў паядынак паўднёвых карэйцаў і грэкаў. Матч выразна паказаў, што ад былой моцы колішніх чэмпіёнаў Еўропы не засталося і следу. Чжун Су Лі распячатаў браму саперніка ў дэбюце, а капітан азіятаў Чжы Сун Пак неўзабаве пасля антракту сольным праходам і трапным стрэлам усталявалі 2:0 на карысць краіны „ранішняй свежасці".

Фестывальны пачатак сустрэчы Аргенціны і Нігерыі пасеяў надзею на шоў. Тым больш, што ўжо на 6-й хвіліне быў адкрыты лік — аргенцінскі абаронец Габрыель Хайнцэ ястрабам у эфектным палёце галавой закалаціў мяч у дзевятку. Але галавара працягу не адбылося. Адной з прычын таму — надзейная гульня брамнікаў. У выніку 1:0 на карысць двухразовых чэмпіёнаў свету. **Група „В": Паўднёвая Карэя і Аргенціна — па 3 ачкі, Нігерыя — 0, Грэцыя — 0.**

Матч Англіі і ЗША ў групе „С" прынёс у выніку роўнасць — 1:1. У пачатку на полі панаваў новаспечаны капітан брытанцаў Стывен Джэрард — ён не толькі забіў хуткі гол, але і быў самым прыкметным. Развіць поспех, аднак, падначаленым Фабіа Капэла так і не ўдалося — забракла імправізацыі і фантазіі. Да ўсяго клас прадэманстравалі амерыканцы. Адыграліся яны пасля нескладанага ўдару Клінта Дэмпсі і сааўтарства брамніка ангельцаў Роберта Грына. Далей зорна-паласатыя пры бездакорнай гульні свайго галкіпера Ціма Ховарда дзеілі ўпэўнена.

У нядзелю славенцы выбіліся ў лідары квартэта „С". Яны абыгралі лісоў пустыні — алжырцаў. Апошнім гульню зламала слушнае выдаленне з-за дзвюх жоўтых картак. І тут вырашальнае слова сказаў капітан Роберт Корэн — алжырскі галкіпер не справіўся з яго ўдарам. 1:0 на карысць Славеніі. **Група „С": Славенія — 3 ачкі, Англія і ЗША — па 1, Алжыр — 0.**

Па аналагічным сцэнарыі разгортваўся і матч Сербіі і Ганы ў групе „Д". Змаганне дзвюх сілавых дружын нагадвала атлетычны спабор і магло завяршыцца нулямі на табло. Але славяне прыдумалі сабе праблемы. Спярша недарэчнае выдаленне абаронца за дзве карткі, а пасля абсурдная гульня рукой Здраўка Кузманавіча ў сваёй штрафной. Бясспрэчны пенальці — прыгавор судздзі на 84-й хвіліне выканаў Азамоа Г'ян. 5-я запар параза сербаў на чэмпіянатах свету.

Немцы як фаварыты квартэта абавязаныя былі брацъ 3 ачкі ў Аўстраліі. Яны гэта і зрабілі, здзейсніўшы бліц-крыг ужо ў першым тайме. Галы ўнікальных форвардаў, якія забіваюць найперш на роўні зборнай, Лукаша Падольскі і Міраслава Клозе забяспечылі „Маншафт" істотную перавагу. У другім тайме натхнёная гульня Нямеччыны прывяла да разгрому — 4:0. Забівалі яшчэ Томас Мюлер і натуралізаваны бразілец Какау. **Група „Д": Нямеччына і Гана — па 3 ачкі, Сербія — 0, Аўстралія — 0.**

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

## Спартыўныя святы ў Чаромсе

Уладзімір СІДАРУК

**Чаромхаўскія школы і мясцовы самаўрад даўно бачылі патрэбу пабудаваць акуратную спартыўную пляцоўку, але ў цяперашняй рэчаіснасці маглі адно памарыць. Прычына ўсім вядомая — сціплы гмінны бюджэт не дазваляў на рэалізацыю інвестыцыі большых памераў.**



Фота: Гмінны цэнтр інфармацыі

— Пры канцы 2008 года падказалі нам, — гаворыць сакратар гміны Марыя Іванюк, — што ёсць магчымасць рэалізаваць праект „Moje boisko — Orlik 2012”. Ініцыятыва была вынесена на пасяджэнне Рады гміны і прынята раднымі. Апрацавалі мы і паслалі праект. Калі стала вядомым, што адобрылі яго, дык пахадайнічалі за грашыма. На гэтую мэту Міністэрства спорту і турызму прызначыла 333 тысячы злотых. Другое ж столькі прызначыла Маршалкоўская ўправа. Кошт інвестыцыі ў агульным падліку склаў суму 1 367 тысяч злотых. Рэшту трэба было нам самім далажыць. Калі справа ставілася на бюджэтнай камісіі, — працягвае субяседніца, — дык радныя аднадушна прынялі прапанову рэалізаваць пабудову ў наступным годзе. 23 снежня 2008 г. падаліся мы ў Сямятычы, каб агледзець стадыён „Орлік”. Спадабаўся нам...

18 студзеня 2009 г. было выдадзена рашэнне на пабудову стадыёна ў Чаромсе. У ліпені быў аб'яўлены аўкцыён на выканаўцу. Аказалася ім Варшаўскае прадпрыемства „Тамэкс”, а падвыканаўцам — беластоцкая фірма „Раміс”. 3 верасня пачалася будова і 9 лістапада была закончана. Варта адзначыць, што пры будаўнічых працах паспяхова справілася з задачамі адзіная жанчына на бульдозеры Эмілія Барташук, аб чым з пашанай выказаўся войт Міхал Врублеўскі ў час адкрыцця стадыёна.

Чаромхаўскі „Орлік” — гэта шыкарны шматфункцыянальны спартыўны аб'ект памерамі 32,10 м х 19,10 м з пляцоўкамі для валейбола, баскетбола, вялікага тэніса і футбола (габарыты гэтай апошняй — 62 м х 30 м). Побач стадыёна змяшчаецца шыкарна абсталяванае памяшканне для спартсменаў і гараж для школьнага аўтобуса, які чарамшане атрымалі ў мінулым годзе. Мадэрнізацыяй гаспадарчага будынка займалася сямятыцкая фірма „Майка”. У ім змяшчаюцца жаночая і мужчынская раздзявальні, памяшканне для трэнера, склад спартыўных снарадаў, прыёмная ды туалеты з умывальняй для інвалідаў.

Афіцыйная адкрыцця стадыёна прыйшлося крыху пачакаць. Гэта адбылося 1 чэрвеня, калі адзначаўся Міжнародны дзень дзіцяці. Мерапрыемства было гміннай імпрэзай, у сувязі з чым ганаровымі гасцямі былі адно павятовыя ўлады на чале са старостам Уладзімірам Пятрочукам, намеснікам Ежы Сіракам і камендантам Дзяржаўнай пажарнай стражы Яраславам Трахімчыкам. Сярод удзельнікаў былі святары праваслаўнага, каталіцкага і евангелічнага веравызнанняў, радныя, настаўнікі, солтысы ды шматлікая публіка.

Аб пабудове спартыўнага аб'екта расказаў кіраўнік мясцовага самаўрада. Асвячэнне стадыёна супольна здзейснілі каталіцкі і праваслаўны святары. Пасля адбыліся спаборніцтвы за кубак войта гміны. Як сказаў ва ўступным слове войт, ад сёлетняга 1 чэрвеня такія імпрэзы будуць праводзіцца штогод. У футбольным турніры ўдзельнічалі восем каманд: Гмінная ўправа, Памежная ахова, „Чыгуначнік”, Добраахвотная пажарная каманда, „Раміс” (з прадпрыемства будаўнікоў стадыёна), Маладзёжная пажарная каманда, „Мірда” і Насычальня шпалаў. У валейбольных спаборніцтвах жанчын удзельнічалі чатыры каманды: „Орлік”, Маладзёжная пажарная каманда, Гмінная ўправа і Асвета. У гэтых апошніх перамагла каманда „Орліка”, другое месца ўзялі маладыя пажарнікі, трэцяе — Гмінная ўправа і апошняе — працаўнікі асветы. Шмат эмоцый было ў футболе. Перамаглі мясцовыя чыгуначнікі 3:2 (пры дадатковым часе пасля нічыёй 2:2) над камандай „Раміса”, а трэцяе месца заваявала Маладзёжная пажарная каманда. Арганізатары пачаставалі ўдзельнікаў імпрэзы бігасам, пячонай каўбаскай і напіткамі. У заканчэнні спаборніцтваў спартсмены зрабілі супольны памятны здымак. Так закончылася чаромхаўская імпрэза асвячання спартыўнага школьнага стадыёна „Орлік”.

## І як тут гаспадарыць?

Міхал МІНЦЭВІЧ

Частка нашай краіны апынулася пад разбуральнай вадой. Гэта трагедыя многіх людзей. Сёлетняя вясна і пачатак лета не спрыяюць сялянам і на нашых тэрыторыях. Размаўляю з Юрым Хаманскім са Спічкоў, адным з буйнейшых гаспадароў у Арлянскай гміне, які абрабляе каля ста гектараў зямлі і спецыялізуецца ў жывёлагадоўлі — разводзіць малочных кароў гальштэйнска-фрызійскай пароды. Ягоны статак налічвае некалькі дзесяткаў штук кароў і маладняку. Гадуе ён таксама коней, а раней трымаў і статак авечак. У яго новая абора і амаль тысячалітровы танк для малака з даільнай апаратурай. У мінулым гэтаму земляробу часта не давалі спакою бяздомныя сабакі, якія нападалі на жывёлу, а таксама ваўкі ды двухногія зладзеі; было пра гэта ў «Ніве».

— Якое сёлета надвор'е?

— Было вельмі мокра. Ліло вясною і цяпер не перастае. Сенакос няўдалы.

— А як бульба? Ужо чэрвень, але ці можна яшчэ дасадзіць, бо многія з-за макраты не пасадзілі...

— Калісь заўсёды садзілі пасля Івана (21 мая), а да Івана не садзілі. Гаварылі: Да Івана бульбы не садзі і авечак не стрыжы. А цяпер садзяць калі прыходзіцца. Помню, што мы калісь пасадзілі бульбу 20 чэрвеня і яна паспела яшчэ нарасці.

— Спічкі распалажаны на ўзвышшы, то ў вас суха.

— І дрэнаж на палях ёсць. Але сенакосу надвор'е не паспрыяла. Толькі пад вечар сонейка паказвалася на дзве-тры гадзіны. І ўсё. Добра ў валкі збіваць і я тыя кілы назапасіў.

— То цяпер людзі сухога сена не збіраюць?

— Няма ўжо каму, няма ўжо жывёлаводаў. Асталося трох ці чатырох, усё зааралі. У вёсцы толькі двое коней, і ў мяне пяць штук. Людзі гадуюць па схільнасці.

— Значыць, земляробства занепадае...

— Падае гадоўля коней. У наваколлі ніхто не трымае жарабца. Даплат да гадоўлі звычайных коней няма; ёсць падтрымка толькі на коней сакольскай пароды. Я сваіх коней пасвю на пашах пасля кароў.

— А «гасцей» — бяздомных сабак, ваўкоў ці зладзеяў — яшчэ не было на Вашым полі?

— Пакуль няма, бо яшчэ не выводзіў у поле быдла. Але хадзілі тут два велізарныя бяздомныя сабакі. Тэлефанаваў я паляўнічым, магчыма, што тых сабак застрэлілі недзе каля Агароднік. Былі гэта вялікія сабакі, якія на людзей кідаліся.

— То зараз колькі ў Спічках гаспадароў?

— Гэта залежыць якіх. Ёсць некалькі такіх, што абрабляюць поле, высяваюць збожжа. Але жывёлаводаў няма. А мне некаторыя вяскоўцы ўскладняюць гадоўлю. Я трымаюся меркавання, што калі селянін трымае быдла, то выводзіць яго на пашу дарогай, якую вызначае шнурам па яе абодвух баках, каб яно не разбягалася. І я так раблю, але знайшоўся такі «зычлівец», які абрывае тыя шнуры. Робіць гэта нават каля свайго поля, каб мае каровы зайшлі да яго ў шкоду, а тады ён тэлефануе на паліцыю. І такім чынам мне прыходзіцца ў такіх і падобных справах бываць на паліцыі. Мне нават такія «зычліўцы» прыаралі 0,35 гектара лугу; паліцыя ацаніла маю страту на паўтары тысячы злотаў, але я ім гэта дарую. І скажыце, як у такіх умовах гадаваць быдла?

— Ці ў Спічках ёсць сяляне, якія пакарысталіся шанцам адысці на структурную пенсію? І як сёння выглядаюць справы з малаком?

— У Спічках ніхто не пакарыстаўся структурнай пенсіяй. За літр малака плацяць у нас па залатоўцы, а ў Пянтніцы даюць бадай па паўтара злота. І калі не будзе ў нас добрага сена, бо дажджы, то не будзе і добрых надояў. Найлепшае майскае сена, бо ў ім многа бялку.

# Адгаданка

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | | | | | | | 11 | 12 | 13 | 14 |
| | 15 | 16 | 17 | | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| | | | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

**Шыфраграма**

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — сербскую пагаворку.

1. пара органаў зроку = 26 _ 23 _ 15 _ 16 _;
2. грызун, кашэчы ласунак = 17 _ 7 _ 8 _;
3. 3,141592653... = 3 _ 14 _;
4. псуецца з галавы = 28 _ 29 _ 6 _ 5 _;
5. напр. інтэрнэт, павуцінне = 12 _ 11 _ 30 _ 31 _;
6. старажытнаегіпецкі бог мудрасці і навукі = 9 _ 10 _ 22 _;
7. з ім душа = 13 _ 2 _ 1 _ 27 _;
8. рашучы крок = 4 _ 25 _ 24 _;
9. шкло ў аконнай раме = 21 _ 20 _ 19 _ 18 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 20 нумара**

Іматра, Сучава, моц, гусь, Баранавічы, дзіва, Ноўгарад, ікона, дзежка, памяць, Біблія.

Рашэнне: **І масы могуць адчуваць сябе адзінокімі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Міхалу Байко** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
***Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.***

**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

**Prenumerata krajowa**
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

**Prenumerata z wysyłką za granicę**
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

**Prenumerata w redakcji**
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2010 roku — 52.

**Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

**Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

**Nakład**: 1 250 egz.

# Простыя дадаткі да агіяграфіі бласлаўлёнага Папялушкі

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

*(пачатак у № 24)*

Згодна з прынцыпамі падляшскай дыпламатыі мы найперш падышлі да вікарнага, які адразу пасля малебна збіраўся ехаць дахаты.

— Niech będzie pochwalony Jezus Chrystus! — выгукнулі мы ў адзін тон.

— Na wieki wieków! Na wieki wieków! — у адказе святара адчувалася лёгкае здзіўленне.

Мы файна прадставіліся, назвалі мэту сваёй піянерскай місіі, заявілі пра культ Ежы Папялушкі ў беларускіх касцёлах ды папрасілі ў ксяндза чагосьці накшталт блаславенства. Відаць, наша пакорлівасць была большай як заведзена ў тутэйшай парафіі. Ці можа паспрыяў нам сам бласлаўлёны? Як вядома, дух ксяндза-пакутніка скарачае дыстанцыю ў фасадных кантактах між клірам і аўчарняй. Між намі таксама адразу спрацавала жаданая камунікацыя.

— Jestem Wojciech, — ксёндз зычліва ўсміхнуўся і паціснуў нам рукі. Пасля ён паклікаў жэстам сялян і тонам добрага пастыра зарэкамендаваў:

— Proszę, porozmawiajcie z gośćmi moi drodzy!

Мы здзівіліся, калі на словы духоўнага адрэагавалі адны жанчыны. Мужыкі, не выключаючы сямейку Папялушкаў, прыкідваліся быццам не чулі слоў пастыра. Праўда, калі той ад'едзе ў сваю Сухаволю, яны таксама стануць з намі размаўляць ды адказваць на пастаўленыя пытанні. Апошняя адкрытасць народзіцца дзякуючы хвалям Радыё Рацыя. Мы былі прыемна ўражаны, калі братанак бласлаўлёнага Ежы Павел Папялушка жыва адрэагаваў на словы Радыё Рацыя:

— Ja słucham Radia Racja, — заявіў нам хлапец. — Fajne tam piosenki macie.

* * *

Але раней мы пазнаёмімся са Станіславай Дэмбоўскай і Рамуальдай Рэўт. У адрозненні ад ксяндзоўскага братанка, жанчыны не чулі пра Радыё Рацыя. Аднак, каб не выглядаць на горшых, яны таксама паставілі нам падобнае пытанне:

— А ведаеце такое Радыё Марыя?

— А хто ж яго не ведае! — адказалі мы дыпламатычна.

Яшчэ нядаўна Сухавольская гміна, калі ўлічыць папулярнасць названага радыёвяшчання, займала першае месца на Падляшскай зямельцы (з улікам каталіцкай Сувальшчыны). Каб не сарваць дараванай нам камунікацыі, мы вокамгненна памянялі тэму і сталі пытаць пра вёсачку. Здзічэлая зелень на многіх панадворках наводзіла знаёмыя думкі пра адміранне і канчыну племяннай цывілізацыі. У згаданым выпадку — цывілізацыі з яцвяжскай нотай...

— Калісь то вясёла было, дзяцей поўная вуліца, — прыгадала з бліскам у вачах пані Станіслава. — A teraz to sami dziadki. Dzieci ўсяго тры будзе. Адно ў sołtysa, — тут пані Стася паказала на жоўтую мураванку ў стылі позняга Герка, на дом, дзе жыве Рамуальда Рэўт. Перад будынкам-гаргараі на каменнай пірамідцы-газоне красавалася блакітная фігура Маткі Боскай. — І яшчэ двое ў Папялушкаў будзе, — наша субяседніца паказала цагляны дом і ўздыхнула: — I na tym koniec...

Акопы абмінула вялікая мадэрнізацыя. Тут не сустрэлі мы статкаў кароў і малочных кааператываў, якімі ганарацца падсухавольскія вёскі Малая Яцвеж, Дамураты, Вялікая Яцвеж... З-за апошняй нястачы мы не пачулі слоў нараканння, як і надзеі, што пасля прылічэння ў лік бласлаўлёных іх аднавяскоўца хтосьці пацікавіцца іх вёсачкай, дапаможа падняцца з сумнага становішча...

— А пра агратурызм у вас не думаюць? — спыталі мы.

— Хай маладыя пра агратурызм думаюць, — пачулі мы ў адказ.

— Як жа не думаюць! — падключыўся да нашай грамадкі Юзаф Васілеўскі. Энергічны мужчына спачатку прыслухоўваўся нашай гамонцы, зразумела, на бяспечнай адлегласці...

— Там, у пачатку вёскі, не бачылі?

Сапраўды, на пачатку Акопаў мы пабачылі мініяцюрны корт абгароджаны сеткай і статак коней. І шыльду, прыздобленую шпітальным ложкам з інфармацыяй пра наём кватэр.

— To ja tam mieszkam, — пахваліўся пан Юзаф.

— Дык гэта вы самі будзеце ўласнікам аргатурыстычнага пансіяната? — у апошняй інфармацыі мы знюхалі асобную, модную тэму.

— То мой сусед, — астудзіў нас Васілеўскі. І згодна з прынцыпамі падляшскай гасцінасці дадаў: — Ale zapraszam, wiecie już gdzie mieszkam...



*Зміцер Косцін размаўляе са Станіславай Дэмбоўскай (справа) і Рамуальдай Рэўт*



*Аўтарка з Ежы і Станіславам Папялушкамі*



*Мемарыяльны камень у Акопах*

Юзаф Васілеўскі чуў не толькі пра Радыё Рацыя, але і пра нашу беластоцкую «Ніву». І гэта не ўсё, што спаткала нас у Акопах. Гаспадар не хаваў сімпатыі для нашай парачкі з мікрафонамі і фотаапаратамі...

— Пра ксендза вам расказаць? Мая жонка з ім у школу хадзіла. Як замяце дарогу ў зіму, то санкамі дзяцей вазілі. Алек Папялушкаў не чакаў, каб яго везлі, ён раненька выбягаў з хаты, таптаў па тых гурбах снегу, каб яшчэ на імшу перад школай паспець. Так і з нашай вёскі да святога дайшоў. Праз працавітасць і вернасць.

Каб усё было ясна. На хрысце будучы бласлаўлёны атрымаў імя Альфонс, таму ў сям'і і Акопах часта кажуць пра яго Алек. Пасля, пад уплывам духовых апекуноў і сяброў, будучы пакутнік і духовы змагар памяняў імя на Ежы або Георгіус, як назваў яго ў час беатыфікацыі на варшаўскім Пляцы Пілсудскага 6 чэрвеня г.г. пасланец Ватыкана.

* * *

Пасля першага візіту ў Акопы мяне натхніла такая думка: калі б у жыцці я мела нагоду сустрэцца з ксяндзом Ежы і пачала да яго гаварыць па-беларуску, ён напэўна адказаў бы мне на сваёй простай мове з Акопаў. Такія думкі ўнушалі мне знаёмства з родным братам бласлаўлёнага Станіславам Папялушкам. У гэтым чалавеку ўразіла праўдзівасць. Калі ў пачатку знаёмства мы спыталі ці ведае ён простую мову, той толькі ўсміхнуўся і адказаў:

— Я інакш і не размаўляю...

Праўда, нягледзячы на прыведзеныя словы, мы доўга не маглі злавіць хвалі паразумення. Зразумела, не па прычыне мовы ці ментальнасці. Станіслаў Папялушка не палае вялікай любоўю да журналістаў. Чаму? Неаднойчы падвяла яго сумленнасць журналісцкай брацыі:

— Гавары ім адно, а яны і так напішуць сваё!

У той момант прыгадалася мне названая ў папярэднім адрэзку мегапапулярная брашура пра бласлаўлёнага. І дурань зразумее, што аўтарка не была ў Акопах. Сюжэт яе кніжкі інтэлектуальны — гэта фактаграфічная копія фільма «Popiełuszko».

*(працяг будзе)*

## 19.06 — 26.06

**(22.03. — 20.04.)** Будзеш дбаць аб кожную дэталь. Агромная самаўпэўненасць і ўпэўненасць у тваіх рацыях, апрача таго працавітасць, паслядоўнасць і трываласць. У пачуццях без большага ўздыму, але і без сварак і іншых скрыгатаў. Людзі будуць прасіць у цябе парад і слоў падтрымкі.

**(21.04. — 21.05.)** Нейкая асоба са знаку Стральца або Рыб захоча пашастацца ў тваіх інтарэсах (22-26.06.); пратрэш вочы і дасі ёй адпаведна па заслугах. Некаторыя скажуць, што ты нахабны, а найбольш тыя, што табе нахабна ўзлазілі на галаву. Каханне толькі за табой цікуе!

**(22.05. — 22.06.)** Засяроджвайся на тым, што прыносіць табе радасць. Абяцанні шэфа (22-23.06.) можаш палічыць выдумкай. З 25.06. некаторыя справы ўцякуць табе з-пад кантролю. Парвеш з тым, што не дае табе шчасця.

**(23.06. — 23.07.)** Клопаты ў падарожжы і цяжкасці на экзаменах (23-27.06.). У апошнім тыдні месяца цяжка будзе вырашаць сур'ёзныя праблемы. Не дзейнічай хаатычна і не рэагуй імпульсіўна. Асабліва дома пільнуй спраў, таму што без арганізаванасці пойдзе ўсё сваім ходам.

**(24.07. — 23.08.)** Да 22.06. вялікая інтуіцыя; здабудзеш падтрымку і сімпатыю. 20-24.06. не пазбегнеш стрэсаў. Моцна трымай руль у далонях! 21-25.06. вылезуць наверх усе твае недахопы; не будзь абыякавым да сур'ёзных спраў.

**(24.08. — 23.09.)** З 23.06. (да 27.06.) будзеш трапляць з адной крайнасці ў другую. Супакойся, сцішы эмоцыі. З 25.06. будзеш як паралізаваны нават у найменшых рашэннях. Чакае цябе творчы хаос, ды пасля буры прыйдзе гармонія.

**(24.09. — 23.10.)** З 25.06. пераадолееш кожную цяжкасць. Знойдзеш час для сяброў. Адкрыйся на тое, што новае і шматабяцальнае — не расчаруешся. Адчуеш у сабе агромную энергію, ды не дасі рады яе закілзнаць.

**(24.10. — 22.11.)** Ведзены інстынктам, можаш пераносіць горы. Знакаміты час на падарожжы — можаш выбрацца на канікулы жыцця. Можаш парваць знаёмства з чалавекам, які даводзіць цябе да стомы. Ідзі за шчасцем — ведаеш, чаго табе трэба.

**(23.11. — 22.12.)** Празмерная самаўпэўненасць адкіне ад цябе людзей (21-25.06.). Захавай большую дыстанцыю да самога сябе. Лёс сыпане грашыма і не мусіш пільнавацца з выдаткамі. Цудоўна складзецца ў пачуццёвых справах. Добрыя ідэі і кемлівасць прынясуць прыбытак, якога табе хопіць, калі не ўзрасце твой апетыт на яшчэ большыя фінансы.

**(23.12. — 20.01.)** Цешся кожнай хвілінай. Выкарыстай нагоды, якія паявяцца. Многа спраў для афармлення. Апошняя дэкада месяца гэта нядобры час на падарожжы, негацыяцыі ці экзамены. Не будзе хапаць ідэй, агорне цябе лянівасць...

**(21.01. — 19.02.)** Сіла, трываласць, многа энергіі, увесь час ты як на пружыне. Ды 23-27.06. завіраванні ў тваім мысленні; не бярыся за важныя рашэнні. Еж трускалкі.

**(20.02. — 21.03.)** Поспехі ў сямейных і хатніх справах. Нечаканыя мілыя госці. Да 22.06. развівай свае таленты. Зрэалізуеш зусім шалёныя ідэі. Дбай аб сябе, сустракайся з людзьмі, якіх любіш. Штораз лепшая форма.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960